◂ № 13 (236) ◂ 1 красавіка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ЛОБАВА ЧАКАЕ ЧАРАПАШКА**

Стар. 6

**КАМУ ДАСТАНЕЦЦА МЕНШАСЦЬ**

Пошук апазіцыйнай стратэгіі па-ранейшаму актуальны, але гэта павінна быць нацыянальная стратэгія, а не імпартны аналаг

Стар. 4

**ЗАСЛАНЫЯ КАНДЫДАТЫ**

Пра асаблівасці выбараў прэзідэнта па-казахску журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з казахскім журналістам Андрэем Грышыным

Стар. 13

**КУРЭЙЧЫК — ПАМІЖ КУПАЛАЙ І КОЛАСАМ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЖАРСЦІ ПА ПАГОНАХ**

Нарыс Марылі Млыноўскай з цыклу «Жаночы дзённік»

▸ **З НАГОДЫ**

# ТРЫУМФ ПАДОБНЫ НА ПАРАЗУ

Вольга ХВОІН

**Абсурднасць у сукупнасці з жорсткасцю сталі звычкай. І калі супраць некалькіх дзясяткаў маладых людзей і бабулек з кветкамі ставяць на вушы тры найбуйнешыя сілавыя структуры: МУС, КДБ, Службу бяспекі Лукашэнкі, гэта ўжо не выклікае здзіўлення. Так прынята. Сістэма працуе на апярэджанне, падаўленне незадаволенасці яшчэ да яе нараджэння. Але тым самым падкопваецца падмурак сістэмы.**




Дзень Волі 25 сакавіка для беларускай апазіцыі — культавае свята. У гэты дзень у 1918 годзе была нарэшце і ўпершыню ў найноўшай гісторыі абвешчаная незалежнасць Беларусі. У час існавання постсавецкай Беларусі ў гэты дзень прадстаўнікі розных плыняў апазіцыі так ці інакш знаходзілі паразуменне і ладзілі мірныя супольныя вулічныя акцыі. Чакалася, што, нягледзячы на поствыбарчыя падзеі, Дзень Волі сёлета калі не пераломіць сітуацыю, то прынамсі пацвердзіць меркаванні аптымістаў: «пратэстны настрой у грамадстве нарастае», «апазіцыя жывая, і дух яе не зломлены».

Парадаксальным чынам акцыя 25 сакавіка як пацвердзіла, так і абвергла гэтыя аптымістычныя чаканні. У шэрагах апазіцыі расказваюць, што цягам апошняга месяца многа незаангажаваных у палітыку людзей выказвала сваю гатоўнасць прыйсці на вулічную акцыю, некаторыя нават заходзілі на офіс партыі БНФ і пыталіся пра месца і час збору. Але арганізатары ледзь не да апошняга дня не маглі даць уцямны адказ на гэтыя пытанні.

Мінгарвыканкам не дазволіў дэманстрацыю ад плошчы Якуба Коласа па цэнтральнаму праспекту Незалежнасці да помніка Янкі Купалы ў скверы з аднайменнай назвай, прапанаваўшы мітынг на ўскраіннай плошчы Бангалор. Моладзевая арганізацыя «Малады фронт» (зарэгістраваная ў Чэхіі) настойвала на сваім плане: толькі плошча Якуба Коласа. Прадстаўнікі іншых партый і арганізацый ад гэтага адмовіліся і заклікалі абмежавацца ўскладаннем кветак да помніка Янкі Купалы. Блытаніна з месцам, часам, фарматам яскрава засведчыла, што цяпер у беларускай апазіцыі ёсць сур'ёзныя праблемы з лідарствам — нехта знаходзіцца пад арыштам, нехта не хоча «нарывацца» і рызыкаваць уласнай свабодай.

Быццам бы можна было гаварыць пра трыумф рэжыму Лукашэнкі — апаненты дэмаралізаваныя і выведзеныя з поля актыўнай палітыкі. Але не ўсё адназначна. Прэвентыўныя арышты, канцэнтраванае застрашванне сведчаць, што ўлады адчуваюць і баяцца выбуху незадаволенасці, іх падтрымка падае. І нематываваная жорсткасць, як, напрыклад, збіццё затрыманых на Дзень Волі дзяўчат у міліцэйскіх аддзяленнях, спроба вярнуць грамадскую свядомасць у рэчышча «адабрамс». Але праблема ў тым, што цяпер перніка няма, а адной пугі для гэтага недастаткова.

Пасля брутальнага разгону вулічнай акцыі 19 снежня ў дзень прэзідэнцкіх выбараў, калі была прадэманстраваная моц рэпрэсіўнай дзяржаўнай машыны, шараговы беларус зразумеў, што супраць лому няма прыёму. Аказалася — ёсць. І ўжо фарміруецца. не меншай сілы асэнсаванне таго, як хутка пагаршаецца эканамічная сітуацыя ў краіне, што знаходжанне пры ўладзе аднаго чалавека столькі часу і на такіх умовах супярэчыць здароваму сэнсу.

Паводле нацыянальнага апытання, праведзенага ў снежні 2010 года Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД), параўнанне «эканамічнага самаадчування» беларусаў пасля прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 года з тым, якім яно было пасля выбараў 19 сакавіка 2006 года, паказвае прыкметнае пагаршэнне. Так, колькасць рэспандэнтаў, якія адзначылі, што іх матэрыяльны стан за апошнія тры месяцы пагоршыўся, узрасла з 12% да 16%, нягледзячы на тое, што сярэдні памер даходаў (уключаючы зарплаты, пенсіі, дапамогі і іншыя заробкі), які прыходзіўся на аднаго члена сям'і ў мінулым месяцы, узрос са 119 да 200 долараў.

Пяць гадоў таму 44,3% меркавалі, што сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі ў бліжэйшыя гады палепшыцца, сёння — толькі 30,6%. Яшчэ 30% апытаных кажуць, што апошнія тры гады іх крыўдзілі прадстаўнікі органаў улады, толькі 49,6% згодныя з заявай Лукашэнкі на IV Усебеларускім народным сходзе, што «палітычны і эканамічны курс развіцця краіны абраны правільна і не будзе мяняцца ў наступнай пяцігодцы».

На жаль, у апазіцыі дакладнага разумення, як скарыстаць абставіны на сваю карысць, пакуль няма. Няма акцэнту на сацыяльны фактар, няма дзейнасці, што была б у той ці іншай ступені навідавоку, што прыцягвала б увагу. Пасля арышту такой колькасці палітычных лідараў, апазіцыя (а гэта не абстрактны панятак, а жывыя людзі) знаходзіцца ў стане насцярожанага чакання далейшых рэпрэсій.

Сацыёлагі НІСЭПД гавораць, што на пытанне: «Ці лічыце Вы сябе ў апазіцыі да цяперашняй улады?» станоўчы адказ далі 18,9% рэспандэнтаў, а на пытанне: «Як Вы ставіцеся да ўдзелу ў публічных дзеяннях для выказвання свайго меркавання?» гатоўнасць да ўдзелу ў мітынгах, дэманстрацыях і пікетах пацвярджаюць 11,8% рэспандэнтаў, да страйку — 8,6%, галадоўкі — 4,6%, узброенай барацьбы — 3,8%. На пытанне: «Што для Вас сёння важней — захаванне цяперашняга стану ў краіне ці яго змяненне?» больш людзей выбіраюць «захаванне»: 49,7% супраць 41,2% (пяць гадоў таму суадносіны былі адваротнымі: 37,4 супраць 53,8%). То бок масавага імкнення да радыкальных пераменаў пакуль не назіраецца.

Але, калі гайкі закручваюцца без аглядкі на тэхумовы, аднойчы разьбу зрывае. Ужо з'яўляюцца прэцэдэнты грамадскай самаарганізацыі. Аматары гурта «Ляпіс Трубецкой» заклікалі людзей сабрацца 2 красавіка каля мінскага клубу «Рэактар» а 19-й гадзіне, каб здаць квіткі і праспяваць разам некалькі песень любімай каманды. Такім чынам выказаць салідарнасць з музыкамі, якія патрапілі ў «чорны спіс», што налічвае больш за 60 асобаў ад культуры з Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі, ЗША.

ЗАЯВА

# БАЖ ВЫКАЗВАЕ ПРАТЭСТ

**З нагоды ўзмацнення ціску на журналістаў Беларуская асацыяцыя журналістаў прыняла адпаведную заяву.**

«Цягам апошніх дзён у Беларусі зноў рэзка пагоршылася становішча са свабодай журналісцкай дзейнасці, — гаворыцца ў заяве. — Напярэдадні Дня Волі ў Магілёве затрымалі, а потым асудзілі да адміністратыўнага арышту ад 3 да 7 сутак журналістаў і сябраў ГА «БАЖ» — Уладзіміра Лапцэвіча, Алеся Асіпцова і Дзмітрыя Салаўёва. У Віцебску на некалькі гадзін затрымалі тэлежурналіста Уладзіслава Стараверава. Усе затрыманні адбываліся па надуманых падставах. 25 сакавіка міліцыя і асобы ў цывільным зноў перашкаджалі выконваць прафесійныя абавязкі журналістам, якія асвятлялі ход вулічных акцый».

Акрамя асуджэння Лапцэвіча і Салаўёва, 28 сакавіка «Вышэйшы гаспадарчы суд адхіліў дзве скаргі да Міністэрства інфармацыі з боку газеты «Народная воля» і «Аўтарадыё», якія спрабавалі абскардзіць папярэджанні Мініфармацыі; стала вядома пра крымінальную справу, распачатую супраць гродзенскага журналіста Андрэя Пачобута па ч.1 арт. 368 КК «Абраза прэзідэнта РБ», пазбавілі акрэдытацыі пры беларускім МЗС галоўнага рэдактара расійскага інфармацыйнага агенцтва «Свабода» Аляксандра Лашманкіна», — адзначаецца ў заяве.

БАЖ падкрэслівае, што «усё гэта з'яўляецца працягам хвалі рэпрэсій супраць журналістаў, якія распачаліся ў краіне пасля 19 снежня 2010 года. Сямёра журналістаў і сябраў БАЖ абвінавачваюцца ў крымінальным злачынстве — арганізацыі масавых беспарадкаў і ўдзеле ў іх. Адзін з іх — Аляксандр Атрошчанкаў — ужо асуджаны на 4 гады калоніі ўзмоцненага рэжыму. Яшчэ шасцёра — Ірына Халіп, Наталля Радзіна, Аляксандр Фядута, Сяргей Вазняк, Павел Севярынец і Дзмітрый Бандарэнка — чакаюць суда. Дагэтуль не вернутая прафесійная тэхніка, якую прадстаўнікі сілавых структур забралі ў рэдакцыйных офісах і прыватных кватэрах журналістаў у часе ператрусаў».

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»:

— выказвае рашучы пратэст у сувязі з пераследам калег;

— патрабуе неадкладна спыніць ціск на журналістаў і сродкі масавай інфармацыі;

— нагадвае, што свабода выказвання з'яўляецца не толькі адной з фундаментальных свабод чалавека, але і крытэрам захавання іншых правоў і свабод.

**Прынята Праўленнем ГА «БАЖ»**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЧАРНОБЫЛЬСКІ ШЛЯХ: «НЕ ЎСЕ ПАМЕРЛІ»

**Таццяна ШЭЛЕГ**

**У Мінску адбылося першае пасяджэнне аргкамітэту па правядзенні Чарнобыльскага шляху. Збор ля Акадэміі навук, шэсце да Чарнобыльскай капліцы і мітынг на Бангалор. Такі варыянт акцыі папярэдне абмеркавалі 28 сакавіка ўдзельнікі сустрэчы.**

Ля капліцы плануецца ўскласці кветкі і памянуць ахвяраў Чарнобыльскай аварыі хвілінай маўчання. А з запрашэннем выступіць на мітынгу арганізатары збіраюцца звярнуцца да вядомых і аўтарытэтных людзей. «Зразумела, будуць выступаць ліквідатары. І прадстаўнікі тых структур, якія возьмуць актыўны ўдзел у правядзенні мерапрыемства», — паведаміў палітык Юры Хадыка.

Ліквідатар аварыі на АЭС Аляксандр Валчанін адзначыў, што мэта акцыі — нагадаць уладам пра чарнобыльскую катастрофу. У гэтым годзе ёй спаўняецца 25 гадоў. «Нагадаць чыноўнікам, што ўдзельнікі ліквідацыі аварыі яшчэ жывыя, не ўсе памерлі. І што сацыяльныя гарантыі ім павінны быць вернутыя», — падкрэсліў Аляксандр Валчанін.

Кіраўнік Партыі БНФ Аляксей Янукевіч адзначыў, што сёння ўлада не схільная і, як бачна, няздольная ісці на кампрамісы. Аднак лічыць: «Ёсць верагоднасць, што мы зможам так арганізаваць акцыю, што будзе дазволенае і шэсце».

«Гэта бяда, якая не пераадоленая. Сотні тысяч беларусаў ужо памерлі ад наступстваў Чарнобыля. Матэрыяльныя страты таксама жахлівейшыя. І самае галоўнае, што небяспека ёсць для будучых пакаленняў. Яна працягвае існаваць», — сказаў палітык. Тэма чарнобыльскай трагедыі і небяспекі запланаванага ўладамі будаўніцтва АЭС павінна, як адзначыў ён, гучаць адной з асноўных.

«Пры гэтым, безумоўна, праблема палітычных вязняў таксама павінна прысутнічаць. І тэма абароны і спынення гандлю нацыянальнымі інтарэсамі», — зазначыў Аляксей Янукевіч.

Як ён мяркуе, Чарнобыльскі шлях пройдзе «пад знакам адзінства, кансалідацыі і салідарнасці усіх дэмакратычных сіл».

СВЯТА

# ПУШКІН У БАБРЫ

**Аляксей ХАДЫКА**

**25 сакавіка ў Бабры з 10 да 17 гадзін на цэнтральнай плошчы старажытнага мястэчка прайшла маніфестацыя, якую наладзіў самы славуты мясцовы жыхар мастак Алесь Пушкін.**

Ён свядома не паехаў на святкаванне ў сталіцу, заявіўшы, што зараз нашмат важней кожнаму свядомаму грамадзяніну персанальна наводзіць парадак ва ўласных ваколіцах. І такія мястэчкі, як Бобр, зусім не менш значныя для краіны, чым сталіца. Пушкін зноў выйшаў у цэнтр мястэчка пад бел-чырвона-белым сцягам, але гэтым разам меў з сабой не проста карціну. Ён прадэманстраваў землякам эскізны план рэканструкцыі цэнтральнай часткі Бабра да 2016 года — 500-годдзя мястэчка.

Дзейнічае Пушкін абсалютна практычна. Афіцыйна звярнуўшыся да кіраўніцтва Беларускай чыгункі лістом 20 лютага, ён дамогся аднаўлення на чыгуначнай станцыі Бобр прыпынку двух пасажырскіх цягнікоў, што звязваюць камунікацыяй Бобр з Віцебскам, Мінскам і Гародняй. Цягнікі пачнуць спыняцца ў Бабры з 29 сакавіка.

Многія ведаюць, што з месяц таму ў Бабры згарэла размалявеная Пушкіным царква. Мясцовы крымінальнік, які справакаваў арышт Пушкіна перад 19 снежня 2010 года, а 12 снежня атрымаў ад Пушкіна ў падарунак абраз Божай маці, падазраваўся жыхарамі Бабра ў гэтым падпале. Містычным чынам ён самотна памёр ва ўласнай хаце 12 сакавіка, праз некалькі дзён пасля пажару.

Алесь Пушкін сустрэў у Бабры кіраўніка Мінскай вобласці Барыса Батуру, які прыехаў, каб ахвяраваць 700 мільёнаў рублёў на адбудову храма. І, здаецца, пераканаў высокае начальства ў тым, што царкву трэба аднаўляць па старых беларускіх архітэктурных узорах (як яна і была пабудавана першапачаткова), а не па маскоўскіх шаблонах. Восьтакое атрымліваецца ў Пушкіна дбанне пра парадак на сваёй малой радзіме.

САЛІДАРНАСЦЬ

# ЕДНАСЦЬ ВЫРАТОЎВАЕ НАРОДЫ

**Эла ОЛІНА**

**Землятрус, цунамі і катастрофа на АЭС у Японіі ўскалыхнулі ўвесь свет. У краіне працуюць выратавальнікі з 110 краін. Не хапае лекаў, не хапае рысу. У жылых раёнах некалькі разоў на дзень выключаюць электрычнасць.**

Масака Тацумі можна назваць паслом дабрачыннасці і культурных кантактаў. Кожны год Тацумі праводзіць знаёмства з традыцыйным адзеннем, цацкамі. Яна дэманструе каляровыя шаўковыя кімано з вышыўкай для дзяўчат, замужніх жанчын і мужчын. А яшчэ яна набывала прэпараты для вывядзення радыяцыі для чарнобыльскіх дзяцей і медтэхніку для дзіцячых шпіталяў. А зараз да яе звяртаюцца мінчукі з прапановай дапамагчы японскаму народу.

«Сродкі для гуманітарных патрэбаў, — гаворыць Масака Тацумі, — я пералічу ў першую чаргу тым японцам, якія раней ахвяравалі грошы для беларускіх дзяцей з пацярпелых рэгіёнаў. У маім спісе было 10 тысяч дабрачынцаў, шукаю іх у інтэрнэце, пакуль знайшла толькі трох, астатнія пакуль што лічацца зніклымі без вестак. Людзям усяго свету ў такія часы трэба аб'ядноўвацца і сябраваць».

Жадаючыя могуць перадаць сродкі на лекі, харчаванне праз спадарыню Тацумі, патэлефанаваўшы па нумару 8 033 639 06 48.

Дапамагчы можна і праз Рэспубліканскі разліковы рахунак Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа: Р\р 3015740099012 отд. 539 ААТ Белінвестбанк, МФО 153001739, ОМП 100265026, код 739, вул. Калектарная, 11.

РЭГІЁНЫ

# ЗАРОБКІ ВЯСКОЎЦАЎ

**Іван БАРЫСАЎ**

**На працягу трох гадзін праводзіў «прамую тэлефонную лінію» для жыхароў Бялыніцкага раёна і вёў асабісты прыём намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Аляксандр Агееў.**

Як паведаміла бялыніцкая газета «Зара над Друццю», «асноўнай тэмай гэтага сумоў'я было выяўленне фактаў некампетэнтнасці, бюракратызму, валакіты, парушэння законных інтарэсаў і правоў чалавека».

Усяго пагутарыла з Аляксандрам Віктаравічам дзевяць чалавек. Асабліва здзівіў намесніка старшыні КДК зварот Аляксандры Адамовіч, якая патэлефанавала на «прамую тэлефонную лінію» ад імя маладой сям'і жывёлаводаў, якія працуюць у СВК «Кудзін» Бялыніцкага раёна. Яна паскардзілася на тое, што за люты гаспадару сям'і налічылі ўсяго 220 тысяч рублёў заработнай платы, а яго жонцы, якая працуе даяркай, — 303 тысячы рублёў.

Аляксандр Агееў аператыўна зрэагаваў на атрыманую інфармацыю і даручыў кіраўніцтву райсельгасхарчу, спецыялістам Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці тэрмінова выехаць у СВК «Кудзін» і аб'ектыўна разабрацца па названай праблеме. Што ж, будзем спадзявацца, што гэтай канкрэтнай сям'і вяскоўцаў пашанцуе, і яны змогуць атрымаць варты заробак.

Між тым, ні для каго не сакрэт, што ў сельскай гаспадарцы зарплаты застаюцца на вельмі нізкім узроўні. Днямі я размаўляў з кіраўніком адной з гаспадарак Магілёўскай вобласці. Ён распавёў пра тое, што кожны месяц з жахам думае пра тое, як выплаціць людзям заробак у тэрмін. Зараз даходы ў сельгаспрадпрыемстваў (за выключэннем лепшых) невялікія, таму даводзіцца аддаваць зарплату за кошт крэдытаў банкаў. Ды і банкі крэдыты ўжо даваць не хочуць, грошы даюць толькі пад ціскам абласной «вертыкалі» ўлады. Мой знаёмы нядобрым словам памянуў перадвыбарчыя падвышэнні заробкаў. Тады, маўляў, зарплатаў усім прымушалі падвышаць, ды і грошы на гэта давалі. А зараз людзі ўжо прызвычаіліся да высокіх заробкаў і за меншыя грошы працаваць проста не хочуць.

Пра якія высокія заробкі ў сельскай гаспадарцы Магілёўскай вобласці можна казаць, калі бальшыня сельгаспрадпрыемстваў вобласці прапаноўвала ў лютым вакансіі механізатараў, жывёлаводаў і нават спецыялістаў сельгасвытворчасці з узроўнем аплаты 460–600 тысяч беларускіх рублёў? У СВК «Вадзвянскае» (у лепшым за 2010 год раёне Магілёўскай вобласці — Шклоўскім) заатэхніку прапаноўваць заробак у 520 тысяч.

КАНФУЗ

# СЛОВА — МАТЭРЫЯЛЬНАЯ СІЛА

**Аляксей ХАДЫКА**

**29 сакавіка не ў Палацы спорту, а ў ДК МАЗа адбыўся канцэрт Эміра Кустурыцы і яго музычнага гурта «No Smoking Orchestra».**

Як прызналіся арганізатары, канцэрт давялося перанесці з-за малога попыту на квіткі — у 4,5-тысячны Палац іх набылі толькі каля 1000. Найбольш тыповая прычына адмовы купляць білеты нават са скідкай, якая гучала з боку тых, да каго арганізатары звярталіся асабіста — выказванні Кустурыцы ў лістападзе, калі ён захапляўся «салодкімі дыктатурамі», да ліку якіх аднёс Беларусь. Вынік атрымаўся цікавы: калі аналагічны канцэрт у 2008 годзе прайшоў з аншлагам у Палацы спорту, то зараз хапіла і ДК МАЗа. Самыя стойкія прыхільнікі выдатнага рэжысёра, бачачы абвестку на зачыненых дзвярах Палацу спорту пра перанос канцэрта на гадзіну пазней (20.00) у больш сціплае памяшканне, мужна сядалі на метро і ехалі да свайго куміра Эміра.

Атрымалася, што Кустурыца трапіў у кампанію з тэнісісткамі Каралін Вазняцкі і Вікторыяй Азаранка. За месяц да прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 года яны правялі дабрачынны матч у Мінску. Толькі дабрачыннасць багата каму падалася перадвыбарчай піяр-акцыяй Аляксандра Лукашэнкі: ён быццам бы выпадкова апынуўся на корце разам з дзяўчатамі. Цікава, наколькі «салодкай» падасца Эміру Кустурыцы такая кампанія?

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ХТО ПАТРАПІЦЬ У ДАЛЕЙШЫМ?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Санкцыі набіраюць абароты. ДзяржДэпартамент ЗША 29 сакавіка заявіў пра ўвядзенне санкцый у адносінах да ВА «Беларуснафта». Прычына — кантракт беларускага прадпрыемства з іранскай кампаніяй «NaftIran Intertrade».**




«Злучаныя Штаты прымаюць дадатковыя меры для ўзмацнення ўціску на Іран за яго адмову выканаць свае міжнародныя абавязацельствы ў сувязі з ядзернай праграмай, — паведамляе Дзяржддэпартамент. — Адзін з ключавых элементаў нашай стратэгіі факусуецца на іранскіх магутнасцях па здабычы нафты і газу, якія, як прызнаецца ў рэзалюцыі Савета бяспекі ААН №1929, Іран выкарыстоўвае для фінансавання сваёй дзейнасці па распаўсюджанні [ядзернай зброі], а таксама для маскіроўкі імпарту тавараў двайнога прызначэння».

«У межах гэтай стратэгіі Дзяржддэпартамент увёў санкцыі ў адносінах да беларускай дзяржаўнай энергетычнай кампаніі «Беларуснафта» ў адпаведнасці з Законам аб санкцыях у адносінах да Ірана 1996 года, дапоўненых Законам аб усёабдымных санкцыях у адносінах да Ірана, прыцягненні да адказнасці і дывесціраванні (канфіскацыі інвестыцый) 2010 года, — за яе ўдзел у іранскім нафтавым сектары», — зазначаецца ў паведамленні.

Дзяржддэпартамент устанавіў, што ў 2007 годзе ВА «Беларуснафта» заключыла кантракт на 500 мільёнаў долараў ЗША з іранскай «NaftIran Intertrade Company» для распрацоўкі нафтавага радовішча Джафейр. Разам з тым закон 1996 года прадугледжвае накладанне санкцый на кампаніі, якія інвестуюць больш як 20 мільёнаў долараў.

Знешнепалітычнае ведамства ЗША нагадвае, што ў верасні мінулага года, у адпаведнасці з законам аб усёабдымных санкцыях супраць Ірана, Злучаныя Штаты прымусілі спыніць інвестыцыі ў іранскі энергетычны сектар пяць кампаній: Total (Францыя), Statoil (Нарвегія), ENI (Італія), Royal Dutch Shell (Нідэрланды) і INPEX (Японія).

29 сакавіка на брыфінгу ў Вашынгтоне афіцыйны прадстаўнік Дзяржддэпартамента Марк Тонер заявіў, што санкцыі азначаюць абмежаванне доступу кампаніі на амерыканскі рынак. «Нават калі зараз яна не вядзе ў ЗША камерцыйную дзейнасць, у яе будзе абмежаваная магчымасць працаваць у ЗША ў будучым», — сказаў Тонер. Паводле яго слоў, кампаніі давядзецца вызначыцца, весці бізнэс у ЗША або ў Іране.

Гаворка ідзе аб чатырох відах санкцый, зазначыў прадстаўнік Дзяржддэпа — гэта забарона на падтрымку экспарту ад Экспартна-імпартнага банка ЗША, на атрыманне экспартнай ліцэнзіі ад урада ЗША, на атрыманне ад прыватнага амерыканскага банка крэдыту больш чым на 10 мільёнаў долараў на працягу года, а таксама на падпісанне кантрактаў з урадам ЗША.

Як заявіў Тонер, увядзенне санкцый з'яўляецца таксама сігналам для партнёраў ЗША ў Еўропе. «Я ўпэўнены, што гэтая кампанія мае ці хоча мець доступ на еўрапейскія рынкі», — сказаў прадстаўнік Дзяржддэпартамента.

9 жніўня 2010 года Савет міністраў Беларусі зацвердзіў Стратэгію развіцця энергетычнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з якой за 10 гадоў планавалася здабыць у Іране больш як 9 мільёнаў тон нафты.

У Іране створана сумеснае беларуска-іранскае прадпрыемства, якое ўдзельнічае ў праекце распрацоўкі радовішча Джафейр. Як гаворыцца ў тэксце стратэгіі, «максімальны аб'ём нафты, плануемы да здабычы беларуска-іранскім сумесным прадпрыемствам да чацвёртага года распрацоўкі радовішча, складзе каля 1,3 мільёна тон у год. Перыяд стабільнай здабычы нафты — 10 гадоў. За 10 гадоўназапашаная здабыча нафты складзе 9,3 мільёна тон».

У прынцыпе, як кажуць эксперты, па вялікім рахунку, ад гэтых санкцый «Беларуснафце» ні холадна, ні горача. «Беларуснафта» не будзе мець магчымасці купляць у ЗША тэхналагічнае абсталяванне. Але, тым не менш, на рынку дастаткова аналагічнага абсталявання, якое можна купіць і ў іншых краінах.

Што да эканамічных стратаў, то іх не будзе, таму што «Беларуснафта» не пастаўляе нафту і нафтапрадукты ў ЗША. Аб'яднанне пастаўляе звадкаваны газ, беларускую нафту і нафтапрадукты. Кампанія іншым разам закупляе і расійскую нафту, перапрацоўвае яе і пастаўляе нафтапрадукты пераважна ва Украіну, дзе ў яе размешчана дачыннае прадпрыемства. Летась «Беларуснафта» не экспартавала беларускую нафту, а сёлета атрымала магчымасць пастаўляць нафту. Эксперт ажыццяўляецца ў Польшчу і пераважна ў Германію.

Адзінае, на што паўплывае рашэнне ЗША, — на імідж беларускай кампаніі. Але пасля мінулых прэзідэнцкіх выбараў, імідж Беларусі і так ніжэй плінтуса. Імідж асобнай кампаніі на гэта наўрад ці паўплывае.

А імідж усё пагаршаецца. 29 сакавіка на шэрагу інтэрнэт-сайтаў са спасылкай на ананімнага прадстаўніка спявачкі Шакіры з'явілася паведамленне, што Шакіра паводле палітычных матываў адмяніла канцэрт у Мінску — быццам бы яе «насцярожвае палітычнае становішча ў Беларусі».

Канешне, гэтае паведамленне было абвергнутае. Канцэрт Шакіры ў Мінску не адменены, ён адбудзецца, заявілі ў канцэртным аддзяленні Палаца Рэспублікі, які выступае арганізатарам канцэрта. Арганізатары не атрымлівалі ніякіх паведамленняў аб адмене, а таксама ніякіх паведамленняў аб змене канцэртнага графіка Шакіры. Чуткі аб адмене канцэрта не маюць пад сабой падстаў, усе білеты, прададзеныя на канцэрт Шакіры, застаюцца сапраўднымі.

Варта зазначыць, што некалькі месяцаў таму акцёры беларускага «Свабоднага тэатра» заклікалі сусветных зорак падтрымаць беларускіх палітзняволеных і падчас гэтай кампаніі салідарнасці адмяніць свае канцэрты ў Беларусі.

Але, каб Беларусь была нармальнай краінай, ці ўзнікалі б такія чуткі?

Зараз застаецца толькі здагадвацца, хто наступны патрапіць пад «іміджавы» ўдар па Беларусі.



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІКАЛАЙ ХАЛЕЗІН



Кіраўнік «Свабоднага тэатру» Мікалай Халезін пасля ўцёкаў з жонкай за мяжу працягвае ладзіць акцыі ў падтрымку беларускай апазіцыі. Цяпер і з удзелам галівудскіх зорак.

28 сакавіка ў Лондане натоўп праваабаронцаў, галівудскія акторы Джуд Лоў і Кевін Спэйсі, кіраўніца беларускага «Свабоднага тэатра» Наталля Каляда, Ірына Багданава (сястра Андрэя Саннікава) сабраліся перад офісам піяр-фірмы «Grayling», якая аказвае паслугі ў прыцягненні інвестыцый у Беларусь. Удзельнікі мітынгу заявілі, што, купляючы прадпрыемствы ў Лукашэнкі, заходнія інвестары дапамагаюць умацоўваць дыктатарскі рэжым у Беларусі. Гучалі патрабаванні неадкладна вызваліць усіх беларускіх палітычных вязняў. «Мы зрабілі сваёй мішэнню кампанію «Grayling», паколькі цяпер яна працуе над прыцягненнем замежных інвестыцый у апошнюю дыктатуру Еўропы і з'яўляецца адзінай буйной PR-кампаніяй у Беларусі», — перадае словы прадстаўніка праваабарончай арганізацыі «Index on Censorship» Майка Харыса рэсурс naviny.by.

Пасля невялікага мітынгу перад парламентам, група актывістаў прайшла ў будынак парламента Вялікабрытаніі, дзе Джуд Лоў і Мікалай Халезін на дзвюх мовах сыгралі спектакль «Пакаленне Jeans».

### СЯРГЕЙ МІХАЛОК



Працягвае дзейнічаць «чорны спіс для музыкаў» — усе канцэрты «Ляпіса Трубяцкога» ў Беларусі адменены.

«Для нас відавочна, што праблемы з правядзеннем канцэртаў пачаліся адразу пасля з'яўлення ў інтэрнэце так званых «чорных спісаў», — зазначыў прадзюсар гурта Яўген Калмыкоў. — Прадстаўнікі радыёстанцый, арганізатараў, выканаўчай улады ў неафіцыйных размовах пацвярджаюць, што гэтыя спісы рэальныя, абавязковыя да выканання, і гэта кантралюецца высокімі інстанцыямі. Больш за ўсё хвалюе, што канцэрты адмяняюць па смехатворных прычынах і ў апошні момант, таму мы прынялі рашэнне самастойна адмяніць канцэрты ў Маладзечна, Салігорску і Жлобіне, каб не мучыць людзей усімі гэтымі бескарыснымі чаканнямі».

Лідар гурта Сяргей Міхалок менш стрыманы ў сваіх выказваннях, ён гаворыць, што ў краіне «ідзе культурны генацыд».

«Я хачу сказаць, што слова «апалітычны» ў сітуацыі з сённяшняй Беларуссю губляе ўсякі сэнс. Чалавек, які сябе так называе, апрыёры становіцца ў адзін шэраг са слугамі сучаснага беларускага рэжыму. Я быў у адным мінскім кафэ і бачыў часопіс, у якім быў топ–50 самых паспяховых людзей Беларусі. Сярод іх я не знайшоў ніводнага мастака, драматурга, паэта, гісторыка, вучонага, мысляра, касманаўта, героя працы. Уся эліта і багема сучаснай Беларусі складаецца з уладальнікаў нейкіх гламурных рэстаранаў, уладальніц вясельных салонаў і касметалагічных кабінетаў, дырэктараў бутыкаў і два-тры папугаі з беларускага тэлебачання. Атрымліваецца, што наша эліта — гэта тыя, хто скача на шматлікіх рэйвах і шансон-канцэртах, бяздумны развяселены мажорны натоўп. У сувязі з гэтым мне здаецца, што ў Беларусі ідзе нейкі культурны генацыд. Я ведаю, што многія цяпер з'язджаюць на Захад — вучыцца, працаваць, таму што не бачаць перспектыў унутры краіны. Кожны разважны, прыстойны, інтэлігентны чалавек любой прафесіі можа ўнесці сябе ў чорны спіс. Такіх, як мы, папросту выжываюць з краіны. Нам не даюць спяваць, іншым не даюць займацца мастацтвам, навукай, бізнэсам. І калі ад нас раней патрабавалася маўчанне, то зараз нас адсюль папросту выганяюць», — гаворыцца ў заяве, якую распаўсюдзіў Сяргей Міхалок.

### ЛЮБОЎ ЧАРКАШЫНА



Фота «Прэзбол»

Беларуская гімнастка Любоў Чаркашына заваявала 5 медалёў (1 золата, 2 срэбныя, 2 бронзавыя) на этапе Кубка свету па мастацкай гімнастыцы ў італьянскім Пезаро. Першае месца Любоў Чаркашына заняла ў практыкаваннях з булавамі, апярэдзіўшы расіянку Дар'ю Кандакову і балгарку Сільвію Міцеву.

Срэбным прызёрам Чаркашына стала ў практыкаваннях з абручом і з мячом, бронзу заваявала ў кампазіцыі са стужкай і ў мнагабор'і. Любоў Чаркашына — майстар спорту міжнароднага класа, выхаванка брэсцкай СДЮСШАР-6.

У групавых практыкаваннях каманда Беларусі (Аліна Тумілові́ч, Ксенія Санковіч, Анастасія Іванькова, Марына Ганчарова, Наталля Лешчык) выйграла золата ў кампазіцыі з двума абручамі і трыма стужкамі, апярэдзіўшы зборныя Расіі і Італіі.

У практыкаванні з пяццю мячамі беларускі сталі срэбнымі прызёрамі, прапусціўшы наперад італьянак і апярэдзіўшы ізраільцянак. У мнагабор'і беларуская каманда заваявала бронзу, саступіўшы расіянкам і італьянкам.

▸ **АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ**

# КАМУ ДАСТАНЕЦЦА МЕНШАСЦЬ

Сяргей НІКАЛЮК

**Пошук апазіцыйнай стратэгіі па-ранейшаму актуальны, але гэта павінна быць нацыянальная стратэгія, а не імпартны аналаг.**



*«А мы все ставим правильный ответ и не находим нужного вопроса».* Гэта Высоцкі, і гэта пра нас. Катаваць сябе і іншых пытаннямі ў нас не прынята. Мы — нацыя гатовых адказаў, і таму, спатыкнуўшыся на праблеме, рэагуем на яе заявай ці маніфестам. Хуткасць рэакцыі залежыць ад глыбіні разумення праблемы: чым меншая глыбіня, тым вышэйшая хуткасць.

Сакавік у гэтым сэнсе стаўся ўраджайным. Да прыкладу спашлюся на дакумент, які з'явіўся ў сетцы пад кідкім загалоўкам: «Байкот дыктатуры — стратэгія перамогі!». Тэкст адпавядае загалоўку. Кожная прапанова ўспрымаецца як загад, а загады, як вядома, не абмяркоўваюцца. І ўсё б выдатна, калі б не апошняя прапанова: «У нас ёсць усе шанцы правесці эфектыўную кампанію байкоту, ізаляваць уладу і прымусіць яе неадкладна вызваліць палітвязняў і пачаць перамовы з апазіцыяй аб правядзенні свабодных выбараў».

Я ўвогуле зарабляю на хлеб напісаннем паліталагічных тэкстаў, аднак логіку аўтараў зразумець не змог, а маніфест, нагадаю, звернуты да шырокай аўдыторыі. У чарговы раз адкрыю слоўнік: «Байкот (анг. boycott) — форма палітычнага і эканамічнага змагання, прадугледжвае поўнае ці частковае спыненне адносін з пэўнай асобай, арганізацыяй, прадпрыемствам...»

Прасцейшую задачу, чым байкот улады, цяжка і ўявіць. Асабіста я здольны байкатаваць нават уладу англійскай каралевы, чым і займаюся на працягу 58 гадоў. Але байкатуючы ўладу Яе Вялікасці, я не спадзяюся, што афіцыйныя асобы Букінгемскага палаца, спалохаўшыся майго байкоту, пачнуць са мной перамовы.

З факту допуску апазіцыі да ўдзелу ў выбарах не вынікае, што ўлада пры гэтым уступае з апазіцыяй у палітычныя адносіны. «Улада, — як адзначае палітолаг Станіслаў Бялкоўскі, — фармуецца ў адным месцы, а выбары праводзяцца ў іншым, у розных сусветах». Гэта азбукавая ісціна для дзяржаў з імітацыйнымі рэжымамі, але ў Беларусі яна чамусьці асвойваецца з цяжкасцю. Зірніце на подпісы ў канцы маніфесту. Сярод падпісантаў — выключна актыўныя ўдзельнікі мінулых выбарчых кампаній. Сёння яны спадзяюцца, што ізаляваная ўлада пачне «перамовы з апазіцыяй аб правядзенні свабодных выбараў». "Не смяшыце мае тапкі". Гэта ў якасці каментару я цытую ўлюбёную прыказку журналісткі Юліі Латынінай.

## Палітычныя арэлі

Акрамя маніфесту палітыкаў сакавік запомніўся заявай Рады інтэлігенцыі. Яго аўтары пачалі за здароўе: «Весці перамовы пра свабодныя выбары з рэжымам, які з'яўляецца нелегітымным, — бесперспектыўна. Ні на сапраўдныя перамовы, ні на сапраўдныя выбары гэты рэжым не пойдзе». Прызнаўшы бесперспектыўнасць перамоваў, што вельмі разумна, аўтары заявы заклікаюць усіх прыхільнікаў дэмакратыі кансалідавацца і... патрабаваць адстаўкі Лукашэнкі.

Маніфест і заява пры знешніх і відавочных адрозненнях, будуюцца на агульным тэарэтычным падмурку. Аўтары дакументаў апазіцыю ўяўляюць палітычным суб'ектам (ад лат. subjectum — носьбіт дзеяння, той, хто пазнае, мысліць і дзейнічае). Выдатнае ўяўленне, вось толькі на чым яно грунтуецца?

Папярэдняя «Азбука» (гл. «Дыялог», «НЧ» ад 18 сакавіка) была прысвечана суб'ектнаму рэсурсу апазіцыі. Ён, мякка кажучы, невялікі. Нам усім «пашанцавала» нарадзіцца ў краіне, дзе ўлада і апазіцыя адначасова моцныя не бываюць. Так ужо ўладкаваная наша рэальнасць: або ўлада выступае ва ўсёй сваёй сакральнай красе, пакідаючы апазіцыі пятачок у выглядзе скверыку побач з пляцам Бангалор, або ўлада *«валяется в грязи»*, і тады на кароткі прамежак часу фармуецца палітычнае поле, а разам з ім і палітычныя гульцы. Усё гэта мы назіралі напачатку 90-х. Хто не памятае — няхай перагартае падшыўкі газет.

Такія арэлі (моцная ўлада — слабая апазіцыя, слабая ўлада — моцная апазіцыя) разбіваюць апазіцыйную стратэгію на своеасаблівыя аналагі ленінскіх праграмы-мінімум і праграмы-максімум. Першая праграма павінна быць рэалізавана на перыяд моцнай улады. У гэты перыяд апазіцыя паўнавартасным суб'ектам быць не ў стане. Суб'ект (гл. азначэнне) пазнае, мысліць і дзейнічае, але для дзеяння аб'ектыўных магчымасцяў сёння няма. Удзел у імітацыйных мерапрыемствах улады, што перыядычна арганізуюцца ў форме выбараў, адносін да рэальных дзеянняў не мае.

Немагчымасць дзейнічаць не адмяняе абавязку пазнаваць і мысліць. Аўтарам маніфесту поспех байкоту бачыцца ў данясенні «праўдзівай інфармацыі да ўсяго насельніцтва краіны». У гэтай сувязі я хачу звярнуцца да аўтараў з асабістай просьбай. Дарагія мае, данясіце праўдзівую інфармацыю да мяне. Мне яе страшэнна бракуе. Інтэрнэт і нешматлікія незалежныя газеты ў гэтай справе не памочнікі. Сур'ёзнай інфармацыі пра беларускае грамадства і ўладу папросту не існуе ў прыродзе. Вось і даводзіцца бягучыя факты і факцікі аналізаваць з дапамогай імпартаваных тэорый.




Каб эфектыўна кіраваць якой-небудзь сістэмай, неабходна мець пэўны аб'ём ведаў пра яе функцыянаванне. У 1991 годзе «Гайдар і яго каманда» прыступілі да эканамічных рэформаў у Расіі. Галоўным вынікам іх дзейнасці стала дыскрэдытацыя дэмакратычных каштоўнасцяў у расійскім грамадстве. На прэзідэнцкіх выбарах 2004 года адзінага дэмакратычнага кандыдата (Ірыну Хакамаду) падтрымала 3,84% выбарцаў. У Беларусі апазіцыйныя кандыдаты атрымліваюць у 7–9 разоў больш! Пашанцавала нам, мы ў «ліхія гады» абышліся без Гайдара.

## Не толькі маральныя дывідэнды

У Гайдара было алібі. Калі Бог раздаваў народам гуманітарныя веды, будучы рэфарматар жыў у СССР. Лічу, каментары тут не патрэбныя. Але з тых часоў шмат вады ўцякло, а мы ўсё гэтак жа кідаемся ад байкоту да патрабавання адстаўкі.

Працытую апошні абзац папярэдняй «Азбукі»: «Не выключана, што чарговы распад не за гарамі. Чым ён завершыцца — шмат у чым будзе залежаць ад узроўню згуртаванасці «меншасці». Менавіта на «меншасці» і варта засяродзіць апазіцыі свае высілкі».

Пакуль апазіцыянеры працуюць над чарговымі пераможнымі стратэгіямі, улада сур'ёзна пачала клапаціцца пра праблемы «меншасці». Па-першае, яна прызнала яе наяўнасць, па-другое, прыступіла да пошуку (стварэння) квазісуб'екта, здольнага стаць выразнікам яго інтарэсаў. Падрыхтавана ўжо і тэарэтычная база. Прывяду асноўную тэзу ў выкананні рэдактара часопіса «Беларуская думка» Вадзіма Гігіна: «Нармальнае дэмакратычнае грамадства, тым больш грамадства, якое развіваецца дынамічна і імкнецца забяспечыць пераемнасць існуючай сацыяльна-эканамічнай мадэлі і стабільнасць палітычнай мадэлі, не можа абысціся без апазіцыі, прадстаўленай у органах улады».

Звярніце ўвагу на слова «стабільнасць». Уладзе неабходна апазіцыя, але канструктыўная, г. зн. спрыяльная стабілізацыі існуючага рэжыму. Сённяшняя апазіцыя для гэтай задачы не падыходзіць. «Гэта людзі, — тлумачыць Гігін, — для якіх апазіцыйная дзейнасць стала сэнсам жыцця. Яны імкнуцца прыйсці да ўлады і выкарыстоўваюць сваю апазіцыйную дзейнасць для канфрантацыі, самафінансавання і самарэкламы». Абапіраючыся на прыведзеную тэзу, намалюю партрэт ідэальнага «канструктыўнага апазіцыянера»: ён цалкам пазбаўлены імкнення да ўлады, ён не марыць пра канфрантацыю з тымі, хто гэтай уладай сёння манапольна валодае, ён не імкнецца да самафінансавання, а тым больш да самарэкламы!

Самафінансаванне робіць чалавека надзвычай небяспечным для ўлады, нават калі ён і не марыць пра палітычную дзейнасць. Гэта ключавы момант. Таму і не ідзе ў рэспубліцы прыватызацыя, не павялічваецца ўдзельная вага прыватнага сектару ў эканоміцы. Беларуская эканоміка заснаваная на цэнтралізаваным пераразмеркаванні рэсурсаў, і манапольным правам іх размяркоўваць валодае ўлада.

Але вернемся да канструктыўнай апазіцыі. Без фінансавання яна не застанецца. Вось што піша з гэтай нагоды ў «Советской Белоруссии» наш стары знаёмы Вячаслаў Оргіш: «Апазіцыя — гэта не абстрактная сутнасць, а жывыя людзі са сваімі эгаістычнымі запатрабаваннямі і праблемамі, якія маюць пэўнае фінансавае выяўленне». Для задавальнення запатрабаванняў апазіцыі Еўрасаюз вылучае ўнушальныя сродкі, «таму, — тлумачыць Оргіш, — калі нехта сур'ёзна думае займацца канструктыўнай апазіцыяй як альтэрнатывай пазасістэмным апазіцыйным структурам, яму таксама давядзецца, жадае ён таго ці не, ускласці на сябе некаторыя матэрыяльныя выдаткі. Сістэмная апазіцыйная дзейнасць павінна прыносіць не толькі маральныя дывідэнды».

## Крыху практычнай сацыялогіі

Што мы маем на сёння? Мы маем недавер, які стабільна павялічваецца, да "адзінага палітыка" (АП): у снежні, паводле апытання НІСЭПІ, яму не давяралі 34% рэспандэнтаў, у сакавіку — 42%. Але не варта думаць, што той, хто не давярае АП, з'яўляецца прыхільнікам апазіцыі. У снежні рэйтынг даверу да апазіцыйных палітычных партый складаў 16%, а рэйтынг недаверу — 63% (дадзеных за сакавік па апазіцыйных партыях няма). З мінулага досведу, аднак, вынікае, што падзенне рэйтынгу АП не прыводзіць да адэкватнага росту рэйтынгу апазіцыйных партый.

У снежні на пытанне «Ці лічыце Вы сябе ў апазіцыі да цяперашняй улады?» станоўча адказала толькі 19% (рэкорд апошніх гадоў). Доля ж «меншасці» ў беларускім грамадстве, г. зн. тых, хто галасуе на прэзідэнцкіх выбарах за прадстаўнікоў апазіцыйных партый, амаль у два разы вышэйшая. Яна практычна роўная долі тых, хто не давярае АП. Якая з гэтага напрошваецца выснова? Амаль палова прагаласаваўшых за апазіцыйных кандыдатаў на апошніх прэзідэнцкіх выбарах галасавала не «за», а «супраць». Зразумела, супраць АП.

Я пачаў «Азбуку» з цытавання Высоцкага. У тэксце яго песні «Лукамор'е» ёсць яшчэ адзін актуальны для нас радок: *«И начались тут его подвиги напрасные, с Баб-Ягами никчемушняя борьба»*. Ва ўмовах моцнай аўтарытарнай улады адкрытая барацьба з уладай можа ажыццяўляцца толькі ў *«никчемушнем»* рэжыме, што мы і назіраем пасля 1996 года. Як бы за гэтай барацьбой не праспаць «меншасць». Час, адпушчаны гісторыяй на рэалізацыю праграмы-мінімум, мяркуючы па навінах, што паступаюць з фінансавых палёў, заканчваецца.

**(працяг будзе)**

ІНІЦЫЯТЫВА

# АДКУЛЬ ЛЮДЗІ БЯРУЦЦА

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**У апошні час улады Беларусі прымаюць адно лёсавызначальнае рашэнне за другім. Не паспеў народ асэнсаваць пачатак будаўніцтва ўласнай АЭС, а яму ўжо прапануюць гарады-спадарожнікі.**

Маем на ўвазе ўказанні, якія даў чыноўніцтву Лукашэнка 25 сакавіка падчас свайго візіту ў Мінскую гарадскую ратушу. Нічога не скажаш, мае чалавек шматбаковы талент. Бо, па-першае, наведаў ратушу. Гэта значыць, аказаў павагу галоўнаму прысутнаму месцу сталіцы, лічы, сімвалу гарадскога самакіравання. Па-другое, зрабіў гэта ў Дзень Волі, калі апазіцыйныя важакі спрабавалі прабіўца праз міліцэйскія заслоны, каб ускласці кветкі да помнікаў народным песнярам Купалу ды Коласу. Па-трэцяе, насамрэч у чарговы раз прадэманстраваў, хто ў краіне ці ў сталіцы ёсць сапраўдным гаспадаром. Сталічныя чыноўнікі, мусіць, аж крякталі ад павагі да вышэйшай асобы, калі тая распавяла ім, нягеглым, што цэнтр цяжару ў жыллёвым будаўніцтве неабходна пераносіць у рэгіёны.

Прынамсі, так паведаміла прэсавая служба «беларускага лідара».

Дарэчы, лідарамі прэзідэнтаў, прэм'ер-міністраў ды іншых першых асоб называюць у некалькі выпадках: у вольным журналісцкім пераказе дыпламатычных сустрэч, у тых выпадках, калі гэта нефармальнае вызначэнне адпавядае ўстаноўленаму афіцыйнаму статусу персоны (напрыклад, лідар Лівійскай Джамахірыі Муамар Кадафі) або да прэзідэнтаў постсавецкіх дзяржаў, якія прысвоілі сабе ўсе фармальныя прычындалы былых генеральных ды першых сакратароў.

А так лідар — беларускі, народны, які заўгодна. З крыху меншымі паўнамоцтвамі, чым у Кім Чэн Іра, але нашмат большымі, чым у амерыканскага прэзідэнта ці ў каралевы Англіі.

Як назавеш карабель, так ён і паплыве. А куды паплыве, гэта асабліва выразна гучыць менавіта на рускай мове: «Как доложил главе государства председатель Минского горисполкома Николай Ладутько…». Па-беларуску такога лаканізму ў дакладным вызначэнні дэмакратычнай субардынацыі дабіцца цяжэй. А калі па-руску, то адразу зразумела, што гістарычныя звесткі аб адмене 150 гадоў таму прыгоннага права — гэта прыгожы міф.

Што ж «доложил» пан старшыня выканкаму гарадской рады (выбранай меснікамі), пану-таварышу лідару? Увогуле, Мікалай Ладуцька распавёў таму пра зусім банальныя і добра вядомыя рэчы. Па-першае, у Мінску падвысіўся попыт на жытло, стала цесна ад аўтамабіляў, што быццам змушае да змены стратэгіі забудовы сталіцы на бліжэйшыя 10–15 гадоў. Не ўвогуле ўсёй стратэгіі, бо, прыкладам, нязменным застанецца лінія на знос састарэлага прыватнага жылога фонду, больш аптымальнае выкарыстанне пустэчаў у горадзе і вакол, але новым прыярытэтам станецца будаўніцтва гарадоў-спадарожнікаў.

Яны размесцяцца адначасова на дастатковай адлегласці ад сталіцы (быццам Месяц ад Зямлі) і дастаткова блізка (як Месяц ад Зямлі ў параўнанні з Марсам), што дазволіць вырашыць мноства




пытанняў. Прыкладам, раней непажаданы ў буйных гарадах элемент высылалі, вобразна кажучы, на 101-ы кіламетр без прадстаўлення жытла, але з абавязковым працаўладкаваннем. На калгаснай ферме ці цагляным заводзе або дзе яшчэ. Зараз жа і не высылаюць увогуле, а толькі перасяляюць. Ды не адміністрацыйнымі метадамі, а эканамічным прымусам. Гэта форма выхавання класікамі як найбольш прагрэсіўная.

Хочаш застацца ў Мінску — калі ласка, але колькасць насельнікаў яго абмежавана асабіста беларускім лідарам і складае 1,8 мільёна чалавек. Калі больш, то сённяшнія сталічныя тлум і таўкатня стануць для людзей невыноснымі. На думку Лукашэнкі, трэба кіравацца выключна інтарэсамі сталіцы і яе насельнікаў. Забудова новых раёнаў дапаможа вырашыць жылёвае пытанне прыкладна 200 тысячам гараджан. А ўсяго на чарзе стаіць 280 тысяч сем'яў. Па словах спадара Ладуцькі, за апошнія дзесяцігоддзе ў Мінск перасялілася каля 170 тысяч чалавек, а з улікам Мінскага раёна, колькасць людзей, што пастаянна знаходзяцца ў сталічным арэале, дасягае 2,2–2,3 мільёна чалавек.

Сапраўды, калі ўлічыць, што за 16 гадоў колькасць насельніцтва Беларусі зменшылася на 900 тысяч чалавек, такі колькасны ўздым сталіцы выглядае ненармальна. Можна сказаць, што дзякуючы яму скарацілася колькасць жыхароў амаль усіх астатніх населеных пунктаў. Нават абласныя і іншыя буйныя гарады ў дэмаграфічным плане не развіваліся. І толькі ў Мінску быў невялікі натуральны прырост. Але абумоўлены амаль выключна прытокам мігрантаў, сярод якіх большасць складаюць маладыя людзі. Мінск стаў нечым напамінаць агромністую галаву, якая запанавала над нездаровым рахітычным целам. Мазгоў зашмат, а ногі не трываюць, а рукі не працуюць, а страўнік выдаляе недастрававаную ежу.

Наконт мазгоў — гэта ж не рытарычнае пытанне. Сённяшняя мінская эліта колькі гадоў таму жыла і працавала, як кажуць, у рэгіёнах. І нядрэнна, дарэчы, працавала, бо змагла ўзяць уладу ў краіне, перасяліцца ў сталіцу, разрасціся колькасна і якасна, атрымаць права распараджацца ўсімі рэсурсамі краіны. І зараз ужо не зразумець, хто каму сват, брат, пляменнік. А за імі папакідалі нівы і палеткі і пацягнуліся астатнія.

Схема тут простая, і амаль для ўсіх крыўдная. Улада канцэнтруе ў сваіх руках грамадскае багацце, да багацця цягнуцца людзі. У гэтым месцы становіцца густа, а ў астатніх пуста. Такі ж прынцып дзейнічаў і раней, але меў усё ж такі значныя абмежаванні.

Дык вось, тым, хто дарваўся да меху, крыўдна, бо амаль ніякіх рэальных заслуг яны перад астатнімі не маюць, а астатнім — бо ім нічога з тых даброт не дасталася.

Увогуле, узнікае ўражанне, што Лукашэнка не ведае, адкуль людзі бяруцца. Ды адтуль, з чаргі. Сядзелі сабе ціха і мірна, але было абвешчана, што ў Мінску «нашым» раздаюць пасады. Адразу ўзнікла чарга. Участкі — чарга, кватэры — чарга... Лепш быць у сталіцы тысяча першым, чым першым нават у аграгарадку. Лепш у Мінску пустыя бутэлькі збіраць...

Вось такія звычаі, што сталі нормай жыцця.

Не ведаю, каго з Мінску ўдасца перасяліць у смалявіцкі ды лагойскі гарады-спадарожнікі? Магчыма, што для заахвочвання для перасяленцаў зусім перастануць браць грошы за жыллёвыя крэдыты, але нават і ў такім выпадку не ўсе пагодзяцца на высяленне. А з іншага боку, колькі можна ўсю гэтую бязглуздзіцу тлумачыць інтарэсамі сталіцы ды яе жыхароў? Што, астатнія, коштам якіх аплачваюцца ўсе гэтыя праекты, не людзі? Інтарэсаў не маюць?

Прыкладам, жыхары Смалявічаў ужо патрабуюць, каб і ім на такіх жа ўмовах было дазволена засяляцца. Бо зямля ж смалявіцкая.

А калі так, то апусцеюць і навакольныя вёскі і аграгарадкі...

ЭКАЛОГІЯ

# РАДЫЯЦЫЯ ДАЛЯЦЕЛА ДА ЕЎРОПЫ

Вольга ХВОІН

**На ліквідацыю наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі Беларусь затраціла 19,4 мільярда долараў. Цяпер на забруджаных тэрыторыях пражываюць больш за мільён чалавек. Але ўрад Беларусі не ставіць за мэту іх адсялення, а мае намер працягваць праграму рэабілітацыі забруджаных зямель.**



У першыя дні і месяцы пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС было эвакуявана 138 тысяч чалавек, каля 200 тысяч самі пакінулі забруджаныя тэрыторыі. Сёння там жыве больш за мільён чалавек. Праблемы чарнобыльскай трагедыі да гэтага застаюцца не вырашанымі.

«Штогод на ліквідацыю аварыі траціцца вялікая колькасць грошай. З 1991-га па 2000 гады страты склалі каля 235 мільярдаў долараў. За 20 гадоў пасля аварыі толькі з нашага бюджэту на ліквідацыю наступстваў катастрофы было затрачана 19,4 мільярда долараў. Калі глядзець на бюджэт 1985 года, то гэта сума — 32 такіх бюджэты, — гаворыць Уладзімір Сінякоў, чалец камісіі Парламенцкага сходу Саюзу Беларусі і Расіі ў пытаннях экалогіі ды ліквідацыі наступстваў аварыяў. На 2011–2015 гады прынятая новая праграма, якая прадугледжвае фінансаванне ў памеры 2,3 мільярда долараў. «Сёння не стаіць пытанне адсялення тэрыторый. У дзяржпраграме асноўным стрыжнем ёсць ідэя адраджэння і рэабілітацыі. Мы мусім за бліжэйшыя гады стварыць умовы, каб там людзям было жыць гэтак жа камфортна, як і на чыстых тэрыторыях», — падкрэсліве Уладзімір Сінякоў.

У краіне на 1 студзеня 2011 года каля 1 мільёна сельскагаспадарчых угоддзяў забруджаныя цэзіем–137, 350 тысяч гектараў — стронцыем–90.

Намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Мікалай Цыбулька гаворыць, што часткова атрымалася наладзіць вытворчасць «чыстай» сельскагаспадарчай прадукцыі.

«З вытворчасцю нарматыўна чыстай прадукцыі на глебах, забруджаных цэзіем, праблем няма, бо ёсць натуральны працэс распаду радыецэзія, замацавання яго ў глебе. Засталося каля дзесяці працэнтаў цэзію рухомага складу, ён пераходзіць у расліны. Ахоўныя меры, што праводзяцца ў краіне, — перасялізацыя гаспадарак на вытворчасць тэхнічных культур, насенняводства, падвышэнне ўрадлівасці глебы — далі вынік, амаль уся прадукцыя па цэзію чыстая. Ёсць праблема са стронцыем–90. Гэты радыенуклід стабілізаваўся ў глебе, і пераход яго ў расліны — адпаведна, у прадукцыю — у большай ступені залежыць ад гідраметэаралагічных умоў. У Хойніцкім, Брагінскім, Нараўлянскім, часткова ў Рэчыцкім, Добрушскім, Нараўлянскім раёнах — ёсць праблемы з вытворчасцю нарматыўна чыстага зерня для харчовых мэтаў. Гэта зерне выкарыстоўваецца для корму скаціны, адпаведна, прадукцыя жывёлагадоўлі атрымліваецца чыстай. Часткова гэтая праблема вырашаецца тым, што ў СПК «Стралічава» быў пабудаваны спіртзавод, і частка зерня ідзе на перапрацоўку. Што тычыцца стронцыю ў малацэ, то, дзякуючы падтрымцы чарнобыльскіх праграм, праграмы МАГАТЭ, на ПУП «Палескія сыры» ў Хойніцкім раёне была зробленая мадэрнізацыя, і ўсё малако з трох забруджаных раёнаў збіраецца і адпраўляецца на перапрацоўку ў сыры і масла, у выніку ўзровень радыенуклідаў укладваецца ў дапушчальныя ўзроўні», — запэўнівае Мікалай Цыбулька.

Дарэчы, прадукцыю і спіртзавода, і мяса- і малочнаперапрацоўчых заводаў, што працуюць на забруджанай сыравіне, можна знайсці ў крамах фактычна па ўсёй рэспубліцы. Актыўна рэалізуюцца праграмы па вяртанню ў севазварот забруджаных зямель. Так, з 1991 года ў севазварот было вернута каля 15 тысяч гектараў.

Да слова, пасля стыхійных бедстваў і аварыі ў Японіі на АЭС «Фукусіма–1» у шэрагу краінаў паўночнага паўшар'я былі выяўленыя сляды радыеактыўнага забруджвання, у тым ліку і ў Беларусі. Дырэктар дэпартаменту гідраметэаралогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Марыя Германчук акрэсліла ўзровень пагрозы ад аварыі на «Фукусіме–1» як мінімальны.

«Ва ўсёй Еўропе, ва ўсім паўночным паўшар'і ў выніку аварыі на атамнай станцыі «Фукусіма–1» выяўленыя сляды радыеактыўнага распаду ядзерных рэчываў. Выяўленыя яны і ў Германіі, і ў Літве, і ў Францыі, Канадзе, Расіі. Выяўленыя сляды атмасфернага радыеактыўнага забруджвання і ў Беларусі. Прычым узроўні настолькі нізкія, што, каб іх выявіць, трэба браць пробы атмасфернага паветра, экспанаваць іх на працягу сутак, — супакойвае дырэктар дэпартаменту гідраметэаралогіі. Яна адзначыла, што маніторынг радыяцыйнай абстаноўкі будзе працягвацца.

▸ ЖЫЦЦЁ

# ЭДУАРДА ЛОБАВА ЧАКАЕ МАРСКАЯ ЧАРАПАШКА

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Чарговыя абвінаваўчыя прысуды — 4 гады турмы для Эдуарда Лобава і 2 гады няволі для Зьмітра Дашкевіча — шакавалі беларускую незалежную супольнасць. Калі Зміцер Дашкевіч — асоба вядомая ў дэмакратычных колах, то пра Эдуарда Лобава многія пачулі ўпершыню.**



Дэсантнік Лобаў

## Хатні заапарк сям'і Лобавых

«Юра, прытрымай Ветачку», — крыкнула мужу Марына Лобава, маці Эдуарда, калі ветліва праводзіла мяне ў двухпакаёвую кватэру на ўскраіне Мінска ў Малінаўцы. Распрануўшыся, я пабачыла Ветачку — вялізнага карычневага і надзвычай прыгожага сабаку, які сціпла сядзеў у калідорчыку і здзіўлена глядзеў на мяне. Тут я прыгадала, як аднойчы ў размове спадарыня Марына згадала, што яны ўсёй сям'ёй ездзілі вандраваць ва Украіну і бралі з сабою сваіх выхаванцаў — двух прыгожых ньюфаўлендаў — маці і дачку.

«Гэта наша малодшая. Маму Шэйлу мы зачынілі ў дзіцячым пакоі, бо яна крыўдзіцца, калі да нас прыходзяць незнаёмыя людзі, і пачынае скуголіць», — спехам тлумачыць спадарыня Марына. Дзіцячы пакой — гэта пакой Эдуарда і ягонага малодшага брата Улада. І хаця Эдуарду ўжо споўнілася 22 гады, а брату — 17, і яны, зразумела, даўно лічаць сябе дарослымі мужчынамі, аднак для маці іх статус «дзяцей» непарушны. «А вось Эдуард заўсёды хацеў сабе ката. Казаў, як будзе жыць адзін, возьме каго з прытулку для жывёл, каб уратаваць ад смерці. Яны з Уладам заўсёды падкормлівалі бяздомных катоў і сабак, што швэндаліся ля дома», — распавядае яна.

Раптам раздаецца «бульк» і, злавіўшы мой пытальны позірк, бацька Эдуарда, спадар Юры, далучаецца да размовы: «Гэта нашы сомікі. Яны выскокваюць з вады, каб каўтануць паветра». І сапраўды, у невялікім акварыуме ў форме бакала для віна плаваюць дзве маленькія вусатыя рыбкі.

Спадарыня Марына сумна ўздыхае: «Ага, а Эдуарда вінавацяць, што цвікадзёрам на вуліцы людзей збівае. Ды ён і мухі не кране! У дзіцячым пакоі яшчэ адзін акварыум — там жыве Эдзікава марская чарапашка. Пайшоў у заакраму і набыў. І сам заўсёды за ёй і за рыбкамі прыбіраў, вычышчаў акварыумы, мяняў ваду. А з таго часу гэта ўсё раблю я».

## «Суддзя нават галаву не ўзняла, не магла глядзець у вочы»

«З таго часу» — з моманту арышту Эдуарда, за дзень да прэзідэнцкіх выбараў. Больш за суткі Лобавы не ведалі, куды знік іх сын, а ўпершыню пабачылі толькі на судзе. «Следчы не даваў мне дазволу на спатканне. А на пашпарце Эдуарда, які мне вярнулі, знайшла надпіс «За Лукашэнку». Пытаюся ў следчага: «Гэта вы за Лукашэнку»? Ён ажно ўскочыў з месца, пачаў апраўдвацца. А дазволу так і не даў», — гаворыць спадарыня Марына. «Ну дык ты ж яму выгаворвала, спрабавала перавыхаваць, сварылася з ім», — усміхаецца спадар Юры, слухаючы спешную гаворку сваёй жонкі.

Тым часам жанчына працягвае: «Як суддзя зачытала прысуд, да мяне падышоў нейкі супрацоўнік і параіў пайсці напісаць заяву на спатканне. Дык суддзя нават галаву не ўзняла, не магла глядзець у вочы. Схіліўшыся да стала, хуценька накрэмзала паперу і аддала мне. Спрабавала на наступны дзень пасля суду патрапіць да Эдзіка, але на Валадарцы столькі людзей — не прабіцца. Відаць, трэба з Уладам прыехаць гадзіне а 7 раніцы, каб паспець. Час я маю, я ж — хатняя гаспадыня. Хацела пайсці на працу, але муж сказаў, што дзеля майго заробку бібліятэкара ў 400 тысяч не варта і пальцам варушыць».



Марына Лобава паказвае калекцыю танкаў, сабраных і размаляваных Эдуардам



Эдуарда чакае дома вялікая сям'я

Праўда, зараз цэлымі днямі спадарыня Марына занятая справамі: «То перадачу адвезці, то з адвакатам сустрэцца, то рэчы забраць. Вунь у пятніцу забрала зімнюю куртку, дык яна ажно смярдзела курывам. А Эдзік жа не паліць, значыцца, гэта ў камеры такі пах. Вымыла і парашком, і іншымі сродкамі, і на балконе павесіла выветрывацца — усё роўна смярдзіць. Прасіў перадаць лягчэйшую куртку, з нашыўкай «Малады Фронт» на рукаве. І кубак з выявай «Пагоні» прасіў набыць — рыхтуецца прыбыць у калонію ў поўнай амуніцыі».

Спадарыня Марына расказвае, што яе жыццё кардынальна змянілася пасля зняволення сына: «Пазнаёмілася з такой колькасцю добрых людзей! Штодня стэлефаноўваемся з бацькамі іншых вязняў. На Дзень Волі тэлефаную Алене Ліхавід, пытаюся, ці павіншавала яна свайго сына са святам. Яна войкнула: забылася, а праца ж да вечара. Мне ж не цяжка схадзіць на пошту — адправіла Мікіту Ліхавіду віншавальную тэлеграму. Падпісала «мама». Паштаркі сабралі цэлы кансіліум наконт словаў «Дзень Волі», але даслалі».

Лобавы сталі наведваць усе апазіцыйныя акцыі, хаця раней хадзілі як атрымоўвалася. Марыну Лобаву часта запрашаюць у амбасады, і паўсюль яна гаворыць пры неабходнасць увядзення эканамічных санкцыяў. На яе думку, гэта адзіны шанец вызвалення ўсіх палітвязняў.

**«Я б не хацела памяняцца месцам з маці спецназаўцаў і суддзяў, якія мусяць саромецца за сваіх дзяцей», — цвёрда і ўпэўнена гаворыць Марына Лобава**

## «Эдзік перахацеў паступаць у спецназ»

Эдуард Лобаў марыў займацца вайсковай справай. Кроўны бацька Эдуарда — вайсковец, услед за якім сям'я пераехала з Вільні ў Паставы. Прадзед юнака служыў у польскім войску, за што камуністы саслалі яго ў лагер на 20 гадоў. Выйшаў праз 10 — па амністыі, пасля смерці Сталіна.

«Эдзік з дзяцінства чытаў вайсковыя кнігі, вывучаў віды зброі, вайсковыя тактыкі. Ён марыў паступіць у ваенную акадэмію, самастойна праходзіў лекараў, ляжаў у шпіталях на абследаваннях. Але яму адмовілі з-за невялікага скрыўлення хрыбта — ён у дзяцінстве патрапіў у аварыю. Для Эдзіка як быццам бы рухнуў сусвет. У ваенкамаце нейкі службовец параіў яму пайсці служыць — маўляў, пасля службы паступіш у акадэмію без праблемаў, і на паказчыкі здароўя ніхто і глядзець не будзе. Я настаяла, каб перад гэтым ён атрымаў хоць якую прафесію, і Эдуард скончыў каледж па спецыяльнасці «слесар кантрольна-вымяральных прыбораў». А пасля пайшоў у дэсант».

Пытаюся, няўжо такі невысокі і худзенькі хлопчык па характарыстыках падыходзіў для дэсантных войскаў? У маім уяўленні дэсантнікі заўсёды былі двухметровымі бугаямі, што шумна купаліся ў фантанах на сваё прафесійнае свята. «Эдзік вельмі вынослівы, — уступае ў размову Улад Лобаў. — Аднойчы ён пешкі дайшоў да лініі Сталіна (45 кіламетраў ад Мінска). А летам мы з ім часта ходзім купацца на Пціч».

Спадар Юры апавядае, што раней Эдуард хацеў ісці ў спецназ, але падзеі 2006 года, калі хлопец пабачыў, чым займаюцца беларускія спецназаўцы, кардынальна змянілі ягонае рашэнне.

Па словах бацькоў, патрапіўшы ў войска, Эдуард першы час быў шчаслівы — ён на свае вочы бачыў зброю, якую раней разглядаў толькі ў кніжках. Эдуард быў самым адданым і адказным салдатам. Напачатку. «Пасля таго, як Эдзіка разам з іншымі салдатамі прымушалі пераносіць снег з аднаго месца на другое і назад, разбіраць і збіраць каробкі са зброяй, ён зразумеў, што нічому карыснаму яго тут не навучаць. І ён, калі і стане афіцэрам, то не зможа добра выхоўваць салдат. Таму ён вырашыў адкласці паступленне ў ваенную акадэмію да часу, калі там сапраўды будуць вучыць ваеннай справе», — гартаючы фотаальбом Эдуарда, працягвае Марына Лобава.

«А перад дэмбелем, — узгадвае малодшы брат, — Эдзік наогул патрапіў на гаўптвахту на 10 сутак. Ён папрасіў мяне раздрукаваць улёткі накшталт «Спыніце беззаконне ў войску» і разляпіў іх па вайсковай частцы. Злавілі. Але пасля гэтага ў частцы сапраўды троху палепшыліся ўмовы — прынамсі, карміць сталі лепш».

Дарэчы, у войску Эдуард пазнаёміўся з сябрам «Маладога Фронту» Андрусём Цянютам, які і захапіў яго маладафронтаўскімі ідэямі. Адразу пасля дэмбеля Эдуард патэлефанаваў Змітру Дашкевічу, з якім моцна пасябраваў. Са Змітром Дашкевічам іх і арыштавалі ў той дзень.

«Ці не думаеце зараз, што лепш было б забараніць Эдуарду усе стасункі з «Маладым Фронтам»? — пытаюся ў маці. «Вы што! Мы наадварот мусім быць удзячнымі і Цянюту, і Дашкевічу, што канчаткова раскрылі вочы Эдуарду на тое, што адбываецца ў нашай краіне. У нас, шчыра кажучы, гэта атрымоўвалася не вельмі паспяхова. А тое, што ён у турме... Для мяне галоўнае, каб сын быў сумленным і шчырым чалавекам, якім я магу ганарыцца. Я б не хацела памяняцца месцам з маці спецназаўцаў і суддзяў, якія мусяць саромецца за сваіх дзяцей», — цвёрда і ўпэўнена гаворыць Марына Лобава.

Падчас нашай сустрэчы ў мяне перад вачыма стаяла асацыяцыя Лобаў-Статкевіч. Абодва прасякнутыя ідэяй беларускага войска, абодва займаюцца палітычнай дзейнасцю, абодва — у турме. Бацькі Лобава пагадзіліся са мной і выказалі спадзяванне, што наступнай асацыяцыяй будзе — абодва на волі.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 6 КРАСАВІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Зацьменне».
**11.40** Відэафільм АТН «Кіраўск» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** «Час радасці». Камедыя (Расія).
**14.05** «Акно ў Еўропу». Інфармацыйная праграма.
**14.25** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «OFF STAGE LIFE».
**15.50** Серыял «Ганначка» (Расія).
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Серыял «Зацьменне» (Расія - Украіна).
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Матч 1-ы. Барселона - Шахцёр. Прамая трансляцыя.
**23.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фіналу. Матч 1-ы . Чэлсі - Манчэстэр Юнайтэд.
**01.55** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Песняры». Беларускі цуд».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.05** Прэм'ера. Шматсер. фільм «Адплата».
**22.20** «След».
**23.30** Асяроддзе пасялення.
**00.30** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** Сапраўдная гісторыя. «Не чорная быль».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.30** «Хірамант 2». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Хірамант 2». Серыял.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Дэтэктыў «Бармэн з «Залатога якара» (СССР).
**11.10** Спорт-кадр.
**11.40** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.25** Медычныя таямніцы.
**13.00** Медычныя таямніцы +.
**13.15** «Ты - тое, што ты ясі». Пазнавальная праграма (Расія).
**13.45** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.50** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.45** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.50** Пазакласная гадзіна.
**17.05** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-5» (ЗША). 5-я серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Эксцэнтрычная камедыя «12 крэслаў» (СССР). 1-я серыя.
**20.40** Калыханка.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** Беларуская часіна.
**22.10** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.45** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.25** Рэальны свет.
**23.55** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-5» (ЗША).

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Геній пародыі. Нядоўгае жыццё Віктара Чысцякова». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Варажба пры свечках».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.45** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Варажба пры свечках».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм'ера. «Асцярожна, люстэркі! Усёвідушчыя». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**10.20** «Дачныя адказ».
**11.25** «Увага: вышук!».
**12.00** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Ляснік».
**23.50** Прэм'ера. Серыял «Тэрмінал».

**EUROSPORT**

**09.30** Ралі. Абу-Дабі.
**09.45** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая. Фінал. Пекін (Кітай).
**11.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Мужчыны. ЗША, Канада, Канада.
**13.00, 15.30, 20.30** Вось дык так!!!
**13.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**14.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**14.30** Самыя моцныя мужчыны свету. Гетэборг (Бельгія).
**16.30** Тэніс.
**17.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая. Фінал. Пекін (Кітай).
**18.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Данія, Нарвегія, Канада.
**21.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.10** Алімпійскі часопіс.
**21.40** «Бізнес-клас». Часопіс.
**21.45** Абранае па серадах.
**22.00** Конны спорт. «Dressage Masters».
**22.30** Навіны коннага спорту.
**22.35** Гольф. US PGA.
**23.35** Гольф. Еўрапейскі тур. Жанчыны.
**23.45** Гольф. Еўрапейскі тур.
**00.15** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.20** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.25** «Спартовае вандраванне. Горныя матацыклы». Часопіс.
**00.35** «Адкрыцці. Марафон». Часопіс.
**00.40** Вось дык так!!!
**01.30** Ралі. Абу-Дабі.
**01.45** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Кітая. Фінал. Пекін (Кітай).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**08.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 31 серыя.
**09.25** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**09.55, 14.25** Праект «Будучыня».
**10.20, 14.50** Рэпартэр.
**10.45** Беларусы ў Польшчы.
**11.00** Два на два (тэледыскусія).
**11.25, 16.45** Навігатар.
**11.40** Сальда (эканамічная праграма).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**13.00** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 31 серыя.
**13.55** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**15.15** «Рок па вакацыях–2008», ч. 2.
**16.05** Беларусы ў Польшчы.
**16.20** Два на два (тэледыскусія).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**17.35** «Доктар Марцін», серыял: 31 серыя.
**18.20** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**18.40** Эксперт.
**19.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.15** Навігатар.
**20.35** Вагон.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Маю права (прававвая праграма).
**21.45** Два на два (тэледыскусія).
**22.10** «Ангельскі тракт», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Іспанія–ЗША.
**00.00** Аб'ектыў.
**00.25** Гарачы каментар.

## 7 КРАСАВІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.30** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.30** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.20** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.15** Серыял «Маршрут літасці» (Расія)
**11.00** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**12.10** «Блаславіце жанчыну». Меладрама (Расія).
**14.25** Дак. цыкл «Невядомая версія».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**15.50** Серыял «Ганначка» (Расія).
**16.50** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Серыял «Абдуры мяне-2» (ЗША).
**22.50** «Клуб рэдактараў».
**23.40** «Сцэны ля мора». Меладрама (Японія).
**01.35** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Песняры». Перапынены палёт».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсерыйны фільм «Адплата». Заключная серыя.
**22.20** «След».
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Сведкі».
**00.30** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**09.50** «Вялікі горад».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.30** «Хірамант 2». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял. Заключная серыя.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Хірамант 2». Серыял. Закл. серыя.
**23.55** «Водбліскі». Серыял.

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Эксцэнтрычная камедыя «12 крэслаў» (СССР). 1-я серыя.
**11.10** Бітва экстрасэнсаў.
**12.15** Дача здароўя.
**12.40** Жансавет.
**13.15** «Ты - тое, што ты ясі». Пазнавальная праграма (Расія).
**13.50** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.50** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.45** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.45** Пазакласная гадзіна.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Эксцэнтрычная камедыя «12 крэслаў» (СССР). 2-я серыя.
**20.35** Калыханка.
**20.50** Тэлебарометр.
**20.55** Беларуская часіна.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/4 фіналу. Дынама (Кіеў) - Брага. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд.

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** Прэм'ера. «Хірург ад Бога... Пірагоў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Варажба пры свечках».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.45** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Варажба пры свечках».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Паядынак».

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Следства вялі…».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Баль на ўвесь свет».
**11.15** «Таямнічая Расія».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.50** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Ляснік».
**21.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Порту (Партугалія) - Спартак (Расія). Прамая трансляцыя.
**23.50** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Тэрмінал».

**EUROSPORT**

**09.30** Ралі. Абу-Дабі.
**09.45** Вось дык так!!!
**10.45** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Германія, Швейцарыя, Канада.
**13.00** Вось дык так!!!
**13.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**14.00** Вось дык так!!!
**14.30** Вось дык так!!!
**15.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Германія, Швейцарыя, Канада.
**16.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны.
**18.00** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Германія, Данія, Канада.
**19.30** Вось дык так!!!
**20.40** Футбол. Навіны.
**20.45** Тэніс. Турнір WTA. 1/8 Фіналу. Чарльстон (ЗША).
**23.45** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Кітай, Нарвегія, Канада.
**01.30** Ралі. Абу-Дабі.
**01.45** Тэніс. Турнір WTA. 1/8 Фіналу. (ЗША). Чарльстон.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Ангельскі тракт», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Іспанія–ЗША.
**09.25** «Доктар Марцін», серыял: 31 серыя.
**10.10** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**10.35** На колах.
**11.05** Госць «Белсату».
**11.20** Маю права (прававвая праграма).
**11.40** Асабісты капітал.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Ангельскі тракт», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Іспанія–ЗША.
**13.55** «Доктар Марцін», серыял: 31 серыя.
**14.40** «Піпі Доўгаяпанчоха», серыял.
**15.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.35** Госць «Белсату».
**15.50** Маю права (прававвая праграма).
**16.15** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**16.40** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял: 19 серыя.
**17.35** «Ангельскі тракт», маст. фільм, 2006 г., Вялікабрытанія–Іспанія–ЗША.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Невядомая Беларусь:«Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Форум (ток-шоу): «Яны і мы».
**22.35** «Апошняя змова Сталіна», дак. фільм, 2009 г., Францыя.
**23.25** Аб'ектыў.
**23.50** Гарачы каментар.

## 8 КРАСАВІКА, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.20** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**12.10** Меладрама «Вораг №1» (Расія.
**14.05** «Школа доктара Камароўскага». Токшоў (Украіна). Заключная перадача.
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Серыял «Ганначка» (Расія).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.50** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** «Кікуджыра». Камедыя (Японія).
**00.30** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**01.00** Дак. цыкл «Неразгаданая гісторыя».
**01.55** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Архіпелаг «Будлаг».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Вясновая серыя гульняў.
**22.25** «Фабрыка зорак. Вяртанне».
**00.45** «Наша Белараша».
**01.20** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял. Заключная серыя.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.30** «Хірамант 2». Серыял. Закл. серыя.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Вячэра з дурнем». Францыя.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Жорсткая літасць». ЗША-Францыя - Іспанія, 2007 г.
**01.55** «Спецпрызн». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Час футболу.
**08.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.35** Эксцэнтрычная камедыя «12 крэслаў» (СССР). 2-я серыя.
**11.05** Кінаспобы.
**11.25** Жывы гук.
**12.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**12.25** «Ты - тое, што ты ясі». Пазнавальная праграма (Расія).
**13.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.20** Прыгодніцкая кінааповесць «Юрка - сын камандзіра» («Беларусьфільм»).
**15.45** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**16.10** Пазакласная гадзіна.
**16.25** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**17.20** Усё аб бяспецы.
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. Таварыскі матч. Беларусь-Чэхія. Прамая трансляцыя. У перапынку: Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.15** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.20** «Пра мастацтва».
**23.50** Хакей. КХЛ. Плэй-офф. Фінал. Матч 1-ы.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм'ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Варажба пры свечках».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.45** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.20** Фільм «Пясочны дождж».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Фільм «Залатая баба».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Вочная стаўка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Развод па-руску».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.05** Прэм'ера. «Ванга вяртаецца! Сакрэтны архіў прадракальніцы».
**22.25** «Нтвшнікі».
**23.35** Прэм'ера. «Дзіўны пол».
**00.45** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Тэрмінал».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Абу-Дабі.
**09.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны.
**11.00** Вось дык так!!!
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. 1/8 Фіналу. (ЗША). Чарльстон.
**13.00** Вось дык так!!!
**13.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны.
**15.00** Спартовая гімнастыка. Мужчыны. Фінал. Берлін (Германія).
**17.30** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Канада.
**19.15** Футбол. Навіны.
**19.30** Тэніс.
**20.00** Тэніс. Турнір WTA. 1/4 Фіналу. Чарльстон (ЗША).
**23.45** Самыя моцныя мужчыны свету. Гетэборг (Бельгія).
**00.45** Відэагульні. Ганновер (Германія).
**01.15** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit. Часопіс.
**01.45** Спартовая гімнастыка. Мужчыны. Фінал. Берлін (Германія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Апошняя змова Сталіна», дак. фільм, 2009 г., Францыя.
**08.25** Праект «Будучыня».
**08.55** «Школа на санцапёку», серыял.
**09.20** Форум (ток-шоу): «Яны і мы».
**10.10** Рэпартэр.
**10.40** «Рок па вакацыях–1996», канцэрт з удзелам Лявона Вольскага, Касі Камоцкай, гурта «Крама» ды інш.
**11.30** Невядомая Беларусь: «Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня.)
**12.05** «Апошняя змова Сталіна», дак. фільм, 2009 г., Францыя.
**12.55** Minsk-Mixt–2008. Канцэрт гурта «Джамбібум».
**13.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**13.35** Праект «Будучыня».
**14.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**14.30** Форум (ток-шоу): «Яны і мы».
**15.15** Рэпартэр.
**15.40** «Рок па вакацыях–1996», канцэрт з удзелам Лявона Вольскага, Касі Камоцкай, гурта «Крама» ды інш.
**16.35** Невядомая Беларусь:«Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 6 серыя.
**17.30** «Апошняя змова Сталіна», дак. фільм, 2009 г., Францыя.
**18.25** Форум (ток-шоу): «Яны і мы».
**19.10** Без рэтушы: «Алег Бябенін: Я застануся», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.25** «Вызваленне», дак. фільм, 2008 г., Беларусь: ч. 2.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі баль», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.10** «Пітбуль», серыял: 6 серыя.
**22.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**23.05** Аб'ектыў.
**23.30** Гарачы каментар.

## 9 КРАСАВІКА, СУБОТА

---

**07.00** Мультфільмы.
**07.30** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.15** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**10.50** Камедыйны серыял «Сваты-4» (Украіна).
**12.10** «Пачатак». Меладрама (СССР).
**14.00** «Час Саюза». Грамадска-палітычнае ток-шоў.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Nota Bene.
**16.45** Дакументальны цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.40** Відэафільм АТН «Таямніца зямлі Обраў» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «OFF STAGE LIFE».
**19.45** Камедыйны серыял «Вясковая камедыя» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** «Жыццё ў ружовым колеры». Біяграфічная драма (Францыя).
**00.15** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**01.10** Дзень спорту.

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Смак жыцця».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** «Мода часоў Леаніда Брэжнева».
**14.00** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Кіеў».
**15.00** Асяроддзе пасялення.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Унук касманаўта».
**17.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.40** АНТ прадстаўляе: «Я спяваю».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.20** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.00** «Што? Дзе? Калі?».
**01.15** Драма «Каханне да дамавіны».

---

**06.40** Фільм «Міхайла Ламаносаў. Брама вучонасці». СССР, 1986 г. Заключная серыя.
**08.00** Фільм «Вячэра з дурнем». Францыя, 1998 г.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.05** Фільм «Асса». СССР, 1987 г. 1-я серыя.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Чорта з два». Украіна, 2009 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Прэм'ера! Фільм «Адплата». ЗША - Вялікабрытанія, 2010 г.
**23.40** Фільм «Скура». ПАР - Вялікабрытанія, 2008 г.
**01.35** «Спецпрызн». Серыял.

---

**07.20** Нашы тэсты.
**07.50** Усё аб бяспецы.
**08.15** Рэальны свет.
**08.50** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.25** Жансавет.
**10.05** Дача здароўя.
**10.45** Тэлебарометр.
**10.50** «Ты і Я-2». Забаўляльнае ток-шоў (Расія).
**11.55** «Страсці па культуры».
**12.40** Прыгодніцкая камедыя «Як я быў вундэркіндам» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**15.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**15.55** Хакей. Таварыскі матч. Беларусь-Чэхія. Прамая трансляцыя.
**18.15** «Смешныя людзі». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.15** Тэлебарометр.
**19.20** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**20.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Чэлсі-Уіган.
**22.20** Жывы гук.
**23.10** Канцэрт Whitesnake. Live In The Still Of The Night (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільм.
**07.15** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**08.55** Фільм «Залатая баба».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Пясочны дождж».
**13.40** Мультфільм.
**14.00** Весткі.
**14.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**14.45** «Сумленны дэтэктыў».
**15.20** «Улада факту».
**16.10** «У агнядышнай лаве кахання. Святлана Святліцкая». Дакументальны фільм.
**17.10** «Пакой смеху».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Прэм'ера. Тэлесерыял «Сваты-4».
**00.25** «Дзяўчаты».
**01.00** Фільм «Выбар маёй матулі».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Увага: вышук!».
**14.00** Фантастычная камедыя «Чорны рыцар».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.20** «Музычны рынг НТБ».
**00.40** Прэм'ера. Крымінальная драма «Межы кантролю».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit. Часопіс.
**10.00** Тэніс.
**10.30** Тэніс. Турнір WTA. Фінал. Чарльстон (ЗША).
**11.30** Спартовая гімнастыка. Мужчыны. Фінал. Берлін (Германія).
**12.30** Спартовая гімнастыка. Жанчыны. Фінал. Берлін (Германія).
**15.00** Спартовая гімнастыка. Фінал. Берлін (Германія).
**17.30** Вось дык так!!!
**18.30** Тэніс. Турнір WTA. 1/4 Фіналу. Чарльстон (ЗША).
**20.00** Тэніс. Турнір WTA. 1/2 Фіналу. Чарльстон (ЗША).
**23.45** Кёрлінг. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Канада.
**01.45** Байцоўскі клуб. Тайскі бокс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.30** «Сонечная дзяржава», маст. фільм, 2005 г., Чэхія.
**09.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 6 серыя.
**09.35** Калыханка для самых маленькіх.
**09.55** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**10.20** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**10.45** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**11.10** Без рэтушы: «Алег Бябенін: Я застануся», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**11.25** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**11.55** «Сонечная дзяржава», маст. фільм, 2005 г., Чэхія.
**13.30** «Таямніца Сагалі», серыял: 6 серыя.
**14.00** Калыханка для самых маленькіх.
**14.25** «Вызваленне», дак. фільм, 2008 г., Беларусь: ч. 2.
**15.00** Форум (ток-шоу): «Яны і мы».
**15.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**16.05** «Ранча», серыял: 47 серыя.
**16.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
**17.50** «Падзенне жалезнай заслоны», 2009 г., Германія: 1 серыя, «Салідарнасць Гэнрыкі».
**18.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Мужчынская справа ганаровая», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**19.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.30** «Расія. XX стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 6.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Суботні сеанс:«Ітан Фроўм», маст. фільм, 1993 г., ЗША.
**23.20** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**23.40** Аб'ектыў.

## 10 КРАСАВІКА, НЯДЗЕЛА

**Першы канал**

**08.05** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальны фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.45** Камедыйны серыял «Сваты-4» ( Украіна).
**12.10** «Чыстае неба». Драма (СССР).
**14.20** «OFF STAGE LIFE».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Відэафільм АТН «У кругазвароце алімпійскага руху».
**16.00** «Грэйсі». Спартовая меладрама (ЗША).
**18.05** Суперлато.
**19.15** Камедыйны серыял «Вясковая камедыя» (Расія).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.30** «Фота за гадзіну» . Псіхалагічны трылер (ЗША).

**АНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** Пакуль усе дома.
**10.55** Прэм'ера. «Час у космас!».
**11.35** Новы «Ералаш».
**11.50** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.25** Фільм «Вас чакае грамадзянка Ніканорава».
**14.00** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Тула».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн рынг».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
**17.25** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны коктэйль».
**18.45** «Вялікая розніца».
**20.00** Контуры.
**21.05** Трылер «Белы шум».
**23.00** Ток-шоў «Кухня».
**23.35** Фільм «Аднойчы ў правінцыі».

**СТВ**

**05.40** Фільм «Міхайла Ламаносаў. У славу айчыны». СССР, 1986 г. 1-я серыя.
**07.00** Фільм «Адплата». ЗША - Вялікабрытанія, 2010 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Асса». СССР, 1987 г. Заключная серыя.
**15.30** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Дынама - Брэст» - ФК «Мінск». Прамая трансляцыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Прэм'ера! Фільм «Яркая зорка». Францыя - Вялікабрытанія - Аўстралія, 2009 г.
**22.55** «Прафесійны бокс».
**23.45** Фільм «Ідзі і глядзі». СССР, 1985 г.
**02.15** «Спецпрызн». Серыял.

**ЛАД**

**07.25** Дабравест.
**07.50** Мір вашай хаце.
**08.05** «Таямніца ваўчынай пашчы». Прыгодніцкі фільм (Расія).
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Медычныя таямніцы +.
**10.55** Школа рамонту.
**12.00** Тэлебарометр.
**12.05** Нашы тэсты.
**12.45** Кінаспробы.
**13.05** «Правы чалавека».
**13.20** Гаспадар.
**13.55** Бухта капітанаў.
**14.35** Дакументальны фільм «Наталля і Георгій».
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Блэкпул-Арсенал. Прамая трансляцыя.
**17.25** Хакей. КХЛ. Плэй-офф. Фінал. Матч 2-і.
**19.20** Конкурс-вікрарына «Дзеці новага пакалення».
**20.25** «Навіны надвор'я».
**20.55** Смешная часіна.
**21.30** Трылер «Імітатар» (ЗША).
**23.50** Культасвет.

**РОССИЯ**

**07.00** Мультфільмы.
**07.20** Тэлесерыял «Сваты-4».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Мультфільм.
**12.25** Фільм «На чужым свяце».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка рамнса».
**15.35** «Гарады і Весі».
**16.35** Дэтэктыў «Начное здарэнне».
**18.20** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
**23.55** Прэм'ера. «Тры дні Юрыя Гагарына. І усё жыццё».

**НТВ**

**07.40** Мультфільм «Кракадзіл Гена».
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая передача». Аўтамабільная праграма.
**10.50** «Баль на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Таямнічая Расія».
**14.10** «Апошняе слова».
**15.10** «Сеанс з Кашпіроўскім».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.10** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**00.50** «Нерэальная палітыка».
**01.20** «Футбольная ноч».

**EUROSPORT**

**09.30** Вось дык так!!!
**10.45** Лёгкая атлетыка. Марафон. Парыж (Францыя).
**12.15** Тэніс. Турнір WTA. 1/2 Фіналу. Чарльстон (ЗША).
**13.30** Велагонкі. Парыж - Рубэ.
**18.00** Спартовая гімнастыка. Фінал. Берлін (Германія).
**20.00** Тэніс. Турнір WTA. Фінал. Чарльстон (ЗША).
**21.45** Бокс.
**23.00** Велагонкі. Парыж - Рубэ.
**00.15** Спартовая гімнастыка. Фінал. Берлін (Германія).
**01.30** Тэніс. Турнір WTA. Фінал. Чарльстон (ЗША).

**БЕЛСАТ tv**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.40** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 6 серыя.
**08.25** «Машына зменаў», тэлесерыял: 4 серыя.
**08.55** Калыханка для самых маленькіх.
**09.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Мужчынская справа ганаровая», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**09.55** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: канцэрт гурта «Ветах».
**10.10** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**10.25** «Расія. ХХ стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 6.
**10.50** Форум (ток-шоу): «Яны і мы».
**11.35** Аблічча таталітарызму: «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм: 1 серыя, «Салідарнасць Гэнрыкі».
**12.30** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.00** «Машына зменаў», тэлесерыял: 4 серыя.
**13.25** Калыханка для самых маленькіх.
**13.55** «Ітан Фроўм», маст. фільм, 1993 г., ЗША.
**15.40** Два на два (тэледыскусія).
**16.05** «Ранча», серыял: 48 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 24 серыя.
**18.00** Дакументальная гадзіна: «Дзеці ў выгнанні. Успаміны», дак. фільм, 2007 г., Расія.
**19.00** «Адмысловы цягнік», 2010 г., Польшча.
**19.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басаном па свеце (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.00** Фільматэка майстроў: «Гіцлі», маст. фільм, 2003 г., Вялікабрытанія.
**23.30** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.40** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Віцебск: (8 029) 308 49 78, Юрый;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________
Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# МІС ЛІВІЙСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

Алег НОВІКАЎ

**Тысячы лівійскіх мужчын гатовыя заключыць шлюб з дзяўчынай, якая прызналася, што яе згвалтавалі і катавалі салдаты Кадафі.**

Гісторыя Іман аль-Абейдзі — адна са шматлікіх чалавечых трагедый, якія адбываюцца з людзьмі ў часы вайны. Іман стала ахвярай салдат Кадафі толькі таму, што родам з Бенгазі. Нядаўнюю выпускніцу факультэта права арыштавалі, а пасля згвалцілі.

Тэма згвалтавання і стаўлення да яго ахвяр — вельмі далікатная для Усходу. Ісламскае права ўвогуле разглядае згвалтаванне як адно з самых цяжкіх злачынстваў. Чалавек, які быў згвалтаваны, належыць да катэгорыі асобаў, якіх прымусілі да гэтага акту, і таму згвалтаванне не ўплывае на ягоны статус у ісламе. Адпаведна, жанчыны — ахвяры гвалту — захоўваюць тыя ж правы, што і цнатлівыя. Адзін з прысвечаных ісламскаму праву сайтаў тлумачыць гэта на прыкладзе: «Існуе правіла, згодна з якім усмешка ці маўчанне цнатлівай разглядаецца як знак згоды пры атрыманні прапановы на ўступленне ў шлюб. Дадзенае правіла будзе дзейнічаць і да ахвяры згвалтавання».

Аднак паралельна ў грамадстве пануе сапраўдны культ цнатлівасці. Традыцыя дыктуе, каб нявеста была выключна цнатлівай. Гэта ўстаноўка так ці інакш ставіць ахвяр згвалтавання ў асобны ранг. У выступах муфціяў на тэму шлюбу часта падкрэсліваецца тое, што маладыя людзі не павінны адмаўляцца ад намераў ажаніцца з такімі дзяўчатамі, а наадварот, аказаць падтрымку, выявіць каханне і клопат.

Іман перспектыва застацца самотнай не пагражае. У нядзелю 27 сакавіка ў тым жа Бенгазі прайшла шматтысячнай маніфестацыя салідарнасці з ёй. Многія з прысутных на ёй мужчын заявілі пра гатоўнасць заключыць з дзяўчынай шлюб. «Кожны з нас быў бы шчаслівы, калі б Іман хацела яго палюбіць і правесці з ім рэшту жыцця», — сказаў журналісту польскай «Gazeta Wyborcza» адзін з дэманстрантаў Мухамед.




Сітуацыя вакол Іман застаецца вельмі напружанай. Невядома яе месцазнаходжанне. Афіцыйныя ўлады выдаюць адну версію за адной

Незвычайны марш кандыдатаў у жаніхі — своеасаблівая праява павагі да ўчынку Іман. У суботу, 26 сакавіка, Іман каля трыпальскага гатэлю «Rixos» распавяла замежным журналістам, якія якраз выйшлі на сняданак, пра тое, як салдаты Кадафі яе злавілі на кантрольна-прапускным пункце, надзелі кайданкі, шмат разоў гвалцілі і пасля доўга катавалі. І ўсё з-за таго, што яна з Бенгазі. Дзяўчына нават узняла спадніцу, каб паказаць сінякі на нагах.

«Салдаты Кадафі абразілі мяне. Яны ловяць жанчын і гвалтуюць іх. Кажу ясна — гвалтуюць. Зрабіце мае здымкі. Хачу, каб увесь свет пабачыў праўду. Хачу пабачыць Муамара Кадафі. Хіба ён не абяцаў усім справядлівасці?» — прамовіла Іман.

Персанал гатэлю, сярод якога відавочна шмат супрацоўнікаў спецслужб, з жахам назіраў за сцэнай. Спачатку афіцыянткі крычалі на Іман, каб яна заткнулася. Пасля спрабавалі прымусіць яе замаўчаць з дапамогай фізічнай сілы. На дапамогу Іман прыйшлі журналісты. Патасоўка закончылася з'яўленнем людзей у цывільным. Якія выцягнулі Іман з гатэлю, пасадзілі ў машыну і звезлі не вядома куды.

Кадры з маналогам Іман і яе збіццём хутка абышлі ўвесь свет.

Лівія — не Саудаўская Аравія, дзе згвалтаваных жанчын нядаўна судзілі па артыкулу «здрада мужу». Аднак ісламскія традыцыі ў Лівіі вельмі моцныя. І, безумоўна, афіцыйныя СМІ паспрабавалі згуляць на тэме таго, што сімвалам рэвалюцыі стала жанчына, якую ніхто замуж не возьме. Аднак, мяркуючы па маніфестацыі ў Бенгазі, людзі звярнулі ўвагу на іншае. Яны пабачылі ў Іман мужнага чалавека і ахвяру гвалту.

«Гэта дзяўчына праявіла нечуваную мужнасць, калі выступіла супраць рэжыму. Таксама яна заслугоўвае павагі за тое, што зламала табу, звязанае з тэмай гвалту. Людзі Кадафі згвалцілі ў Лівіі шмат жанчын і не панеслі за гэта ніякага пакарання. І перш за ўсё таму, што самі ахвяры маўчалі, баючыся рэакцыі людзей вакол іх. Іман адкрыла сваё няшчасце цэламу свету, уратаваўшы сябе ў духоўным сэнсе», — кажа адзін з жыхароў Бенгазі.

Між тым, сітуацыя вакол Іман застаецца вельмі напружанай. Невядома яе месцазнаходжанне. Афіцыйныя ўлады выдаюць адну версію за адной. Спачатку афіцыйныя СМІ распаўсюдзілі інфармацыю пра тое, што Іман прыйшла ў гатэль пад мухай і несла абы-што. Акрамя таго, быццам, далі пра сябе ведаць яе старыя псіхічныя хваробы. Пасля сталічная паліцыя пазнала ў ёй прастытутку і злодзейку, якая даўно была ў росшуку. Нарэшце, супраць затрыманай высунулі абвінавачанні ў абразе гонару вайскоўцаў, якія, па яе словах, яе згвалтавалі. Сярод іншых згадваецца імя сына аднаго генерала.

Некія крыніцы кажуць, што зараз Іман апынулася ў руках спецслужб, якія прапануюць ёй вызваленне за тое, каб яна публічна заявіла, што ўсё сказанае ў гатэлі — лухта. Аднак усе разумеюць, што гэта падман. Пазней Іман можа распавесці, якімі сродкам было выбіта прызнанне. Таму ўсе баяцца самага страшнага. Нарэшце, кажуць, што яе могуць падсадзіць на наркотыкі, каб яна за нейкую дозу распавяла ўсё, што патрэбна ўладам. А 29 сакавіка нехта ад імя Кадафі тэлефанаваў маці Іман і прапаноўваў вызваленне дзяўчыны, а таксама грошы або дом узамен на абвяржэнне распаўсюджанай ёй інфармацыі.

Між тым, у Бенгазі Іман ужо чакае патэнцыйны муж. Як піша прэса, сям'я Іман падпісала шлюбны кантракт з адным са шматлікіх прэтэндэнтаў. Засталося дачакацца нявесту.

P.S.: На згаданай вышэй маніфестацыі ў Бенгазі адзін з кавалераў Іман нёс плакат: «Што Расія скажа наконт Іман?» — намёк на тое, што Пуцін асудзіў вайсковую інтэрвенцыю ў Лівію.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Беларусь фактычна дапусціла 10-працэнтную дэвальвацыю сваёй валюты на міжбанкаўскім рынку, але застаецца незразумелым, ці дастаткова будзе такога фінансавага кроку, каб даць магчымасць аўтарытарнаму лідару Аляксандру Лукашэнку ўмацаваць дзяржаўныя фінансы. Больш высокія цэны на імпартаваную расійскую нафту і рэзкае павелічэнне ўрадавых выдаткаў спрыялі з'яўленню ў Беларусі велізарнага дэфіцыту гандлёвага балансу, а таксама «з'елі» валютныя рэзервы краіны, якія апусціліся на 30% з канца мінулага года. Беларускія чыноўнікі раней заяўлялі, што няма ніякай неабходнасці ў афіцыйнай дэвальвацыі беларускага рубля. Яны ўскладалі надзеі на тое, што Расія дасць пазыку ў 3 мільярды долараў, а таксама на кантралюемы Масквой надзвычайны фонд для постсавецкіх дзяржаў. Аднак, як кажуць аналітыкі, прыток грошай стане толькі часовым выратаваннем.

**«The Wall Street Journal» (ЗША)**

Беларускія валютныя рэзервы амаль вычарпаныя, рэальны дэфіцыт бюджэту дасягае катастрафічных велічынь, над краінай навісла пагроза дэвальвацыі. Трэба спыніць Лукашэнку цяпер, інакш ён стане другім Кадафі.

**«Le Monde» (Францыя)**

Тое, што Захад пасля 19 снежня сур'ёзна закусіў цуглі і зараз пойдзе ў справе звяржэння Лукашэнка да канца, таксама паказваюць наступныя дзве далёка ідучыя тэндэнцыі. Па-першае, пачалася кампанія па адмене канцэртаў у Мінску вядучых сусветных зорак эстрады. Глухое нараканне мінскай вуліцы, сярэдняга класа і моладзі, нават з БРСМ (лукашэнкаўскага камсамола) сёння абсалютна зразумелае — гэты электарат афіцыйным Мінскам прайграны назаўжды. Па-другое, на Захадзе пачалася кампанія па выяўленні і пратакаляванні фактаў злачынстваў асабіста Аляксандра Лукашэнкі. Займаецца гэтым адна з сур'ёзных брытанскіх юрыдычных кампаній «H2O Law». Такім чынам, мы бачым, што, нягледзячы на паразу 19 снежня, Захад, тым не менш, не толькі не спыніўся ў сваім наступе на рэжым Лукашэнкі, але і зрабіў яго значна больш сістэмным і канцэптуальным.

**«Росбалт» (Расія)**

Чым часцей беларусы бываюць у еўрапейскіх краінах, тым лепш яны ставяцца да ЕС, спрашчэнне кантактаў і адмена віз — самы важны крок у кірунку дэмакратызацыі Беларусі. Зрабіць гэта трэба як мага хутчэй, не ўвязваючы дадзенае пытанне з планамі будаўніцтва АЭС і перамовамі з рэжымам.

**Delfi (Літва)**

За 16 гадоў свайго прэзідэнцкага кіравання Лукашэнка, падобна, перарабіў краіну па шаблону Савецкага Саюза, з калгасамі і пяцігадовымі планамі, састарэлымі заводамі і КДБ. Людзі паверылі яму, паколькі ён змог вырашыць праблемы наступстваў распаду СССР. Але цяпер шмат хто пачынае разглядаць стабільнасць як стагнацыю. На Захадзе Беларусь мае кардоны з краінамі Еўрапейскага Саюза — Польшчай, Латвіяй і Літвой, — і на гэтых сваіх суседзяў людзі глядзяць з зайздрасцю.

**«The New York Times» (ЗША)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### АЎСТРЫЯ. СІМПСАНАЎ ЦЭНЗУРУЮЦЬ

Маштабная антыатамная грамадзянская кампанія ў ФРГ, выкліканая падзеямі ў Японіі, захоплівае ўсё новыя і новыя сферы. 250 тысяч чалавек выйшлі на вуліцы пратэставаць супраць планаў кансерватыўнага ўраду працягнуць эксплуатацыю нямецкіх АЭС. Цяпер антыатамную справу працягвае аўстрыйская кампанія ORF, якая таксама вядзе трансляцыі на паўднёвую частку ФРГ. Кіраўніцтва кампаніі заявіла, што будзе выразаць з папулярнага мультыплікацыйнага серыялу «Сімпсаны» сцэны, дзе галоўны герой жартуе на тэму атамнай катастрофы. Нагадаем, што Гамер Сімпсан, адпаведна сюжэту, працуе на атамнай станцыі і часта выклікае на АЭС аварыйныя сітуацыі. Як лічаць на ORF, у кантэксце таго, што адбываецца ў Японіі, жартаваць з тэмы мірнага атаму не карэктна.

**Па матэрыялах «LeMonde» (Францыя)**

### ФРАНЦЫЯ. МУСУЛЬМАН ПРЫМУСЯЦЬ НАСІЦЬ ЗЯЛЁНЫЯ ЗОРКІ

Абдарахман Даман, ісламскі актывіст з Парыжу, прыдумаў незвычайную форму пратэсту супраць намеру адміністрацыі Сарказі пачаць дэбаты наконт свецкасці. Лідары ісламскай грамады баяцца, што дэбаты стануць працягам кампаніі супраць мусульман, якія складаюць галоўную частку эмігрантаў. Як вядома, раней Сарказі забараніў паранджу і спрасціў правілы высылкі эмігрантаў. Абдарахман вырашыў не дапусціць новай хвалі ксенафобіі за кошт раздачы ў прыгарадах Парыжу зялёных зорак. Ён заклікае мусульман насіць тыя зоркі на адзенні ў публічных месцах. Канатацыя відавочная. Падчас вайны ўсе яўрэі мусілі насіць жоўтыя зоркі. Актывіст плануе, што акцыя будзе буйная. Інакш бы ён не замовіў аж 600 тысяч зялёных зорак.

**Па матэрыялах «20 minute» (Францыя)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. ЛОНДАН ГАТОВЫ ПРЫЗНАЦЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ФЛАНДРЫІ

Нарабіў шуму нечаканы прыём, які Давід Кэмеран, прэм'ер Вялікабрытаніі, даў для лідара фламандскіх нацыяналістаў Барта Дэ Вевера. Нагадаем, што з-за сабатажу Новага Фламандскага Альянсу (NVA) — партыі Дэ Вевера — Бельгія ўжо больш за год не можа атрымаць урад. Усе кажуць пра хуткі падзел краіны на Валонію і Фландрыю. Ці размаўляў госць з гаспадаром на гэту тэму, пакуль не вядома. Сам Вевер шматзначна параўнаў свой візіт у Лондан са славутым прыездам Махатмы Гандзі ў брытанскую сталіцу, пасля якога пачаўся працэс выхаду Індыі са складу Брытанскай імперыі. Праўда, сам Кэмеран кажа, што прыняў фламандца выключна як саюзніка па фракцыі ў еўрапарламенце, куды ўваходзяць партыя торы і NVA. У любым выпадку, бельгійская прэса ацаніла сустрэчу як падножку для тых бельгійскіх палітыкаў, якія спрабуюць пачаць дыялог наконт фармавання нацыянальнага ўраду.

**Па матэрыялах «LeSoire» (Бельгія)**

### ЗША. ІНДУІСТЫ ПАТРАБУЮЦЬ ЗАБАРОНЫ ЁГІ



Група індуістаў з арганізацыі «Hindu American Foundation» пачала кампанію «Take Back Yoga» (англ.: вернем ёгу), сэнс якой у тым, каб супрацьстаяць павальнай модзе на заняткі гімнастыкай ёгі. Апошнім часам гэта практыка стала вельмі папулярная сярод шматлікіх амерыканцаў (і не толькі). Індуісты ў сваю чаргу лічаць, што гэта здзек з індуісцкай рэлігіі, адным з фрагментаў якой з'яўляецца ёга. Аднак гэта не значыць, што вернікі патрабуюць ад інструктараў ёгі вучыць кліентаў, як любіць бога Вішну і іншых прадстаўнікоў індуісцкага пантэону. На іх думку, пазбаўленыя рэлігійнага зместу фізічныя заняткі ёгай негатыўным чынам уплываюць на асабісты лёс тых, хто гэтым займаецца. Таму яны заклікаюць амерыканцаў — фанатаў ёгі не гнявіць багоў. Прапаганда індуістаў атрымала такое рэха, некаторыя вядомыя цэнтры заняткамі ёгі былі вымушаныя прыняць адпаведныя заявы наконт таго, што аргументы «Hindu American Foundation» — гэта проста рэлігійная і нацыяналістычная прапаганда. Затое індуісты нечакана знайшлі падтрымку сярод радыкальных баптыстаў. Па іх словах, ёга «разбурае хрысціянскую душу».

**Па матэрыялах «Washington Post» (ЗША)**

### ІРАН. СТВОРАНА ЛІГА АМАТАРАЎ ГІТЛЕРА

Арганізацыя называецца «Сябры трэцяга Рэйху і Адольфа Гітлера». Яе заснавальнікам стаў нехта Хамідрэза Нікбаш — 20-гадовы хлопец, які характарызуе сябе як фанатычны шыіт. Аднак значна цікавей тое, што, па інфармацыі апазіцыі, сярод заснавальнікаў арганізацыі прысутнічае адзін з былых генералаў гвардыі Аховы рэвалюцыі (элітная частка ісламістаў). Адказ на пытанне, чаму ісламскіх фанатыкаў зацікавіла асоба Гітлера, відавочны. Антысеміцкая рыторыка заснавальніка Трэцяга Рэйху пасуе праціўнікам Ізраілю. На сайце пра гэта гаворыцца адкрыта. Акрамя сіяністаў, іранскім нацыстам не падабаюцца камуністы. У любым выпадку, тое, што іранскія сімпатызанты фашызму могуць працаваць легальна, шмат кажа пра твар цяперашняга іранскага рэжыму.

**Па матэрыялах «Jungle World» (Германія)**

---

СЕПАРАТЫЗМ

# АД SORTU ДА BILDU

*Алег НОВІКАЎ*




**У дзявяты раз Мадрыд адмовіў баскскім левым нацыяналістам у рэгістрацыі партыі. Нацыяналісты, як «нармальныя героі», вырашылі пайсці ў абыход.**

На 22 мая ў аўтаномнай Краіне Баскаў прызначаныя мясцовыя выбары. Іх вынікі ні для каго не мелі ніякага значэння. Галоўная інтрыга заключалася ў тым, ці будзе ўдзельнічаць у выбарах «Izquierda abertzale» — так называюць лагер баскскіх левых нацыяналістаў.

Яшчэ ў 2003 годзе іх вядучая партыя «Batasuna» была забароненая за сувязь з тэрарыстамі з групоўкі ЕТА. З таго часу восем разоў сябры былой «Batasuna» спрабавалі пад рознымі назвамі вярнуцца ў вялікую палітыку, аднак усё дарэмна. Вярхоўны суд з падачы МУС раз за разам прызнаваў створаныя фармацыі нелегальнымі з-за таго, што іх актыў быў заўважаны ў кантактах з «Batasuna».

Патавая сітуацыя, здавалася, пачала мяняцца ўвосень мінулага года, калі тэрарысты з ЕТА заявілі пра аднабаковае спыненне вайсковых дзеянняў. Пазней яны ўвогуле адмовіліся ад метадаў гвалту. Грамадства ў цэлым вітала крокі ў напрамку заканчэння вайскова-палітычнага канфлікту, які цягнецца ў Краіне Баскаў з 1950-х гадоў.

У такой грамадскай атмасферы «Izquierda abertzale» паспрабавала вярнуцца ў палітыку (ходзяць чуткі, што менавіта яе людзі і прымусілі ЕТА пайсці на міраву). Так ці інакш, у снежні актывісты «Izquierda abertzale» заявілі пра стварэнне новай партыі «Sortu» («Паўстань!»), якая адразу абвясціла пра намер удзельнічаць у майскіх выбарах.

Як і трэба было чакаць, новая арганізацыя адразу апынулася ў фокусе інтарэсу кампетэнтных органаў. Праз нейкі час паліцэйскае ведамства запатрабавала забароны «Sortu» па той жа прычыне — паводле наяўнасці ў яе кіраўніцтве значнай колькасці былога кіраўніцтва «Batasuna».

З іншага боку, так проста «Sortu» забараніць было нельга. Заснавальнікі партыі зрабілі ўсё, каб іх не ідэнтыфікавалі з ЕТА. Галоўная саступка — рэвалюцыйны пункт у партыйнай праграме, які асуджвае метады гвалту ў барацьбе за дасягненне незалежнасці краю. Акрамя таго, у «Sortu» знайшлося моцнае лобі ў выглядзе групы дэпутатаў Еўрапарламенту і шэрагу міністраў Паўночнай Ірландыі. Нават баскская секцыя ўрадавай Іспанскай сацыялістычнай працоўнай партыі (PSOE) схілялася да таго, каб падтрымаць фракцыю «галубоў», якая задае тон у «Izquierda abertzale».

Калі ў «Izquierda abertzale» пануюць «галубы», то ў Мадрыдзе — «ястрабы». Сярод кіраўніцтва краіны папулярная думка пра тое, што саступкі з боку нацыяналістаў — следства шэрагу апошніх удалых паліцэйскіх аперацый супраць кіраўніцтва ЕТА. Таму, па логіцы міністраў, час дабівацць ворага, а не шукаць з ім кампрамісу. У выніку Вярхоўны суд вынес рашэнне пра забарону «Sortu».

Рэакцыя на вердыкт дастаткова супярэчлівая. Адназначна яго вітаюць толькі кансерватары. Нават сярод сацыялістаў няма адзінства на гэты конт. Катэгарычную пазіцыю супраць занялі прафсаюзы і шматлікія баскскія арганізацыі кшталту Асацыяцыі баскскай мовы. Таксама рашэнне суду не спадабалася Еўропе. Прыкметай таго стала пашырэнне колькасці сяброў Міжнароднай кантактнай групы (дэпутаты парламенту ЕС, якія выступаюць за дыялог). Асноўны аргумент крытыкаў іспанскай Феміды — «Sortu» была забароненая не па факту парушэння заканадаўства, а ў якасці прэвентыўнай меры, што супярэчыць прынцыпам права.

Між тым, праз 4 дні пасля забароны нечакана з'явілася новая заява ЕТА наконт палітычнага моманту. Тэрарысты пацвердзілі намер прыпыніць тэракты і заклікалі да стварэння міжнароднай камісіі па кантролю над сваім раззбраеннем. Гэта кажа, што сярод «Izquierda abertzale» пераважае ідэя спрыяць далейшай легітымізацыі руху.

Аднак значна большую цікавасць у публікі выклікала заява сацыял-дэмакратычнай партыі «Eusko Alkartasuna» (EA) і партыі «Alternatiba». Іх лідары абвясцілі пра стварэнне выбарчай кааліцыі «Bildu» («Аб'яднацца»). Галоўныя задачы блоку — даць імпульс барацьбе за суверэнітэт Краіны Баскаў і змаганню за сацыяльную справядлівасць.

Хаця EA з'яўляецца старым суб'ектам баскскай палітыкі (EA — левы адкол 1986 года ад старой Партыі баскскіх нацыяналістаў) інфармацыю пра стварэнне «Bildu» ўлады сустрэлі вельмі падазрона. Усе згадваюць, як яшчэ ў снежні мінулага года стваральнікі «Sortu» казалі, што ў выпадку правалу рэгістрацыі маюць план «В» для ўдзелу ў выбарах.

Пра дэталі плану «В» яны не казалі, аднак большасць экспертаў дапускала, што размова ідзе пра тое, каб зарэгістравацца ў якасці незалежных кандыдатаў у рамках якой-небудзь кааліцыі, створанай на базе ідэйна блізкіх да іх партый — закон дазваляе грамадзянам быць кандыдатамі ад такіх міжпартыйных картэляў, не будучы пры гэтым сябрамі партыі, якія яго ствараюць. Гэтую дзірку ў заканадаўстве і збіраюцца, на думку аналітыкаў, выкарыстаць нацыяналісты.

Здаецца, нешта падобнае і адбываецца. Інакш бы лідары «Bildu» не заявілі, што будуць дабівацца пашырэння сваіх шэрагаў за кошт новых саюзнікаў. Інакш бы EA не асудзіла забарону «Sortu» і не заклікала да агульнанацыянальнай маніфестацыі пратэсту ў Більбаа. У сваю чаргу, Альфрэда Рубакальба, першы намеснік прэм'ера, паведаміў пра тое, што ўрад будзе адсочваць усе спробы «Sortu» пралезці на выбары праз іншыя структуры. Ці значыць гэта таксама пераслед усіх партый, якія ўвойдуць у склад кааліцыі «Bildu», пакажа бліжэйшы час.



ВЫБАРЫ

# ЗАСЛАНЫЯ КАНДЫДАТЫ

**3 красавіка Казахстан пераабірае Назарбаева. Галоўнай асаблівасцю кампаніі стала адсутнасць у выбарчых спісах дэмакратаў, якіх замянілі абсалютна лаяльнымі палітыкамі. Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з казахскім журналістам Андрэем Грышыным.**




***— Як можна ахарактарызаваць сітуацыю, што склалася напярэдадні выбараў?***

— Сітуацыя гратэскная. Ёсць дзейны прэзідэнт, які ідзе на выбары, загадзя ведаючы пра перамогу з 95 працэнтамі галасоў выбаршчыкаў, і яшчэ тры кандыдаты, якія на самай першай фазе кампаніі заявілі пра сваю лаяльнасць да дзейнага прэзідэнта. Гэта кіраўнік Партыі патрыётаў Казахстана сенатар Гані Касымаў, камуніст Жамбыл Ахметбекаў і эколаг Мэлс Елеўсізаў. Шукаць інтрыгу вельмі цяжка. Нават самі афіцыйныя СМІ прэзентуюць выбары як рэферэндум па прэзідэнцкай праграме «Казахстан–2020». Гэта дакумент прадугледжвае стварэнне ў краіне ўласнай таварнай вытворчасці, канкурэнтаздольнай эканомікі. Можа, ідэя і нядрэнная, аднак нашто яе прыймаць у фармаце выбараў прэзідэнта?

***— Ці былі раней выпадкі выкарыстання на выбарах ліпавых апазіцыянераў?***

— Рэжым рэкрутаваў падобных палітыкаў у патрэбныя яму моманты. Каб бясконца абірацца прэзідэнтам у Казахстане, Назарбаеў заўсёды паказваў, што ў краіне няма мудрых людзей, палітыкаў, бізнэсмэнаў. Можна шмат каго прыгадаць. Думаю, з усіх гэтых прозвішчаў вам можа нешта сказаць выключна імя Гані Касымава. Ён балатаваўся ў 1999 годзе і нарабіў шуму сваім ролікам на тэлебачанні. Там ён далонню сціскае і ламае шклянку ў знак сур'ёзнасці сваіх намераў.

Аднак палітыкі такога калібру выкарыстоўваліся, каб імітаваць дэмакратычнасць і плюралізм выбараў. Таксама заўсёды на выбары пускалі 1–2 апазіцыянераў. Гэтыя выбары нонсенс.

***— Чаму апазіцыя не ўдзельнічае ў выбарах?***

— Улады, натуральна, кажуць, што яны папросту баяцца на роўных канкураваць з Назарбаевым. Аднак, думаю, галоўны фактар — фармат выбараў. Пасля крытыкі з боку Захаду ідэі правядзення рэферэндуму пра працягненне прэзідэнцкага тэрміну, яе вырашылі перагуляць у датэрміновыя выбары. А вось у плане палітычнай тэхналогіі адбыўся збой сістэмы. Улады, з аднаго боку, не прадумалі версію, што апазіцыя можа абвесціць байкот. Мяркую, калі б у адміністрацыі было больш часу, яны б выклікалі ў апазіцыі штучны раскол па гэтаму пытанню і дабіліся балатавання якоганебудзь дэмакрата. З другога боку, назіралася вялікая плынь жадаючых стаць прэзідэнтам. Фільтраваць яе пачалі вельмі позна.

***— Нашто траім апазіцыйным кандыдатам удзельнічаць у гэтых выбарах?***

— Вядома, што існуюць самыя розныя матывы запісацца ў кандыдаты. Напрыклад, каб пасля важна сябе называць экс-кандыдатам. Самі яны кажуць, што змагаюцца за другое месца, якое дасць ім правы лічыцца лідарам апазіцыі. Аднак усе з тых, хто ўваходзіць у фінальную пульку, з'яўляюцца людзьмі сістэмы, якія гуляюць па інструкцыях. Не сакрэт, што ўсе высокія чыноўнікі і заўважныя палітыкі з'яўляюцца аб'ектам распрацовак КНБ (Камітэт нацыянальнай бяспекі). Тут варта працытаваць прэзідэнта, які казаў пра тое, што ён хоць зараз кожнага палітыка можа за руку ўзяць і адвесці ў суд.

***— Ці маюць кандыдаты роўныя магчымасці?***

— Мяркуючы па замерах, колькасць згадванняў трох альтэрнатыўных Назарбаеву кандыдатаў у прэсе практычна дасягнула паказчыкаў узгадвання Лідара Нацыі. Праўладная прэса гасцінна расчыніла свае абдымкі для Касымава, Елеўсізава і Ахметбекава. Аднак слабасць як палітыкаў трох падстаўных кандыдатаў і іх марыянетачнасць настолькі відавочная, што так званая «канкурэнцыя» нагадвае імітацыю, прычым жудасна дрэнная якасці. Выхад кандыдатаў сітуацыю не выратаваў.

***— Як ставіцца да ўсяго гэтага грамадства?***

— Па-рознаму. Некаторыя намагаюцца атрымаць ад усяго гэтага задавальненне. Некаторыя, каб шакаваць людзей, абвяшчаюць сябе фанатамі Касымава або Ахметбекава. Узнік нават тэрмін «засланыя кандыдаты». Іншым сорамна. Яны бачаць ва ўсім гэтым здзек з нацыі, якой на поўным сур'ёзе спрабуюць падсунуць відавочную туфту пад выглядам выбараў. У гэтым плане выбары хутчэй дыскрэдытавалі рэжым. Ходзіць папулярны анекдот пра тое, што гэтыя выбары проста ганебны правал, свядомая падрыхтаваная правакацыя групы паліттэхналагаў у адміністрацыі. Яны вырашылі падставіць Назарбаева і падсунулі яму ідэю датэрміновых выбараў. Ніякага інтарэсу да прэзідэнцкай кампаніі электарат не праяўляе. Кампанія прайшла вельмі пасіўна. Думаю, што яўка 3 красавіка будзе вельмі нізкай.

***— З аднаго боку, улада сябе дыскрэдытавала, а з іншага — аспрэчыць вынікі галасавання 3 красавіка народ не здольны. Ці ёсць пагроза, што цяпер усе выбары будуць праходзіць па падобнай мадэлі?***

— Думаю, што гэта няправільны прагноз. Усё ж тут галоўную ролю згуляў цэйтнот, у якім апынулася Астана. У дадатак — адсутнасць крэатыву і немагчымасць зразумелых палітычных манеўраў. Акрамя таго, міжнародная супольнасць стоадсоткава падвергне гэтая выбары крытыцы. І ніякімі байкамі пра фармальна роўныя магчымасці з дэманстратыўным падкрэсленнем празрыстасці выбараў нікога ўжо не падмануць. Відавочна, што падобных праколаў улады будуць намагацца не допускаць. Аднак, па якой мадэлі пройдуць наступныя выбары, казаць цяжка. Вельмі шмат будзе залежаць ад перастановак у кабінеце — па канстытуцыі, пасля выбараў стары ўрад адразу сыходзіць у адстаўку.

> Гэтыя выбары проста ганебны правал, свядомая падрыхтаваная правакацыя групы паліттэхналагаў у адміністрацыі. Яны вырашылі падставіць Назарбаева

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВІКТАР ЯНУКОВІЧ



Супрацьстаянне прэзідэнта Украіны з палітычнымі працўнікамі набывае таксама адкрыты канфесійны фармат. Пра гэта можна казаць пасля таго, як у Кіеве прайшла інтранізацыя новага главы адной з самых уплывовых цэркваў Украіны — грэка-каталіцкай (уніяцкай). Галоўнай інтрыгай мерапрыемства аказалася нават не абранне ў сан вярхоўнага епіскапа 40-гадовага айца Святаслава, а збор на мерапрыемстве лідараў апазіцыі. Плюс дэманстратыўная адмова ад трансляцыі цырымоніі на дзяржаўным тэлебачанні. Хапала і іншых непрыемных для ўлады эксцэсаў. «У першую чаргу, мы заўсёды былі салідарнымі і будзем салідарнымі з асноўнымі братамі — праваслаўнымі Кіеўскага Патрыярхату», — абвясціў кіраўнік УГКЦ, абняўшыся перад камерамі з Патрыярхам Кіеўскім Філарэтам. Нагадаем, што Кіеўскі патрыярхат — галоўны канкурэнт Расійскай Праваслаўнай Царквы (РПЦ). Філарэт, дарэчы, 17 сакавіка заявіў пра гатоўнасць падтрымаць «народную рэвалюцыю супраць улады» Віктара Януковіча. Сам украінскі прэзідэнт, які з'яўляецца вернікам той самай РПЦ, аказаўся больш тактычным. На прэзідэнцкім сайце апублікаванае віншаванне на адрас айца Святаслава з нагоды яго абрання.

### ЭВА МАРАЛЕС



Прэзідэнт Балівіі марыць перакроіць палітычную карту свету. 24 сакавіка ў Балівіі афіцыйна адзначаецца Дзень мора, прысвечаны сумнай даце. Свята з'явілася ў календары пасля таго, як у 1879 годзе Балівія ў выніку вайны з Чылі страціла выхад да Ціхага Акіяну. Тая падзея на доўгі час стала нацыянальнай траўмай. Толькі ў апошнія гады, пасля таго, як у Балівіі і Чылі да ўлады прыйшлі сацыялісты, пачаўся пошук кампрамісу. Чылійскі ўрад нават прапанаваў балівійцам базу для стварэння свайго марскога вайсковага флоту. Аднак Маралес нечакана сапсаваў дыялог. Прэзідэнт заявіў, што ў міжнародны трыбунал у Гаазе будзе накіраваны запыт наконт прызнання чылійцаў акупантамі. У Маралеса сур'ёзныя намеры. З ініцыятывы прэзідэнта будзе створаная парламенцкая камісія «па прабліеме акіянскіх прэтэнзій». Між тым, простыя балівійцы не падзяляюць рэваншысцкіх настрояў прэзідэнта. Супраць ініцыятывы вяртання акупаваных чылійцамі тэрыторый, адпаведна апытанням мясцовага тэлебачання, выступаюць 58 працэнтаў электарату. Што тычыцца чылійскага ўраду, то там заявы Маралеса разглядаюць як «памылковы крок».

### ВІНФРЭД КРЭЧМАН



Лідэр партыі Зялёных нямецкай зямлі Бадэн-Вюртэмберг, якому стукнуў 61 год, зрабіў сапраўдную рэвалюцыю, наступствы якой могуць змяніць палітычны ландшафт усёй Германіі. Крэчман мае цудоўныя шансы стаць першым у гісторыі ФРГ зямельным зялёным прэм'ерам. Гэта цалкам рэальна пасля таго, як на выбарах у рэгіянальны парламент 27 сакавіка эколагі абышлі сацыял-дэмакратаў (першыя атрымалі 24, а другія — 23 працэнты). Пры гэтым і першыя і другія, праўда, прайгралі хрысціянскім дэмакратам (38 працэнтаў). Аднак разам з эсдэкамі эколагі маюць парламенцкую большасць і, адпаведна, права разам сфармаваць урад. Калі б год таму нехта сказаў Вінфрэду, што ён дасягне такога поспеху, той, напэўна, вельмі здзівіўся б. Зялёныя ў сярэднім не набіралі ў ФРГ больш за 12 працэнтаў. Два чынніка змянілі ўсё: дарагі і непапулярны праект новага вакзалу ў Штутгарце і катастрофа ў Японіі, якая выклікала істэрыю ў насельніцтва Бадэн-Вюртэмбергу, дзе знаходзіцца некалькі станцый АЭС. Аднак поспех Крэчмана — толькі пралог сапраўднай інтрыгі. Калі Вінфрэд на пасадзе губернатара добра сябе зарэкамендуе, поспех можа паўтарыцца праз паўтары гады на выбарах у Бундэстаг. У такім выпадку наступным канцлера Германіі стане сябра партыі Зялёных.

МЕРКАВАННЕ

# ПАМІЖ КУПАЛАМ І КОЛАСАМ

**Андрэй Курэйчык — адзін з тых, хто ўваходзіць у так званы чорны спіс. Пра чорныя спісы, стан беларускага кіно і ўвогуле беларускай культуры з вядомым рэжысёрам гутарыць журналіст «НЧ» Андрэй Расінскі.**



***— Андрэй, нядаўна Вы выйшлі з Савета па культуры, што пры міністэрстве, пратэстуючы супраць чорных спісаў, куды ўключылі і вас. Як гэта адбылося?***

— Чорныя спісы пачаліся раней. Пасля 19 снежня я надрукаваў свае разважанні, дзе выказаўся, што думаю пра брутальны разгон дэманстрацыі. Пасля гэтага рэдактары дзяржаўных газет паціху забаранілі сваім журналістам пісаць пра прэм'еры маіх твораў. А ў студзені ў Міністэрстве культуры мне адкрытым тэкстам сказалі, што у Адміністрацыі прэзідэнта незадаволеныя маім снежаньскім лістом. Так што чорныя спісы былі апошняй кропляй.

Дарэчы, яны ставяць міністра інфармацыі Алега Праляскоўскага, які заявіў, што гэта ўсё лухта, у ідыёцкае становішча. Калі спісы ёсць, а ён не ведае, то яго ў дзяржаўным апараце трымаюць за дурня. Калі гэта ўсё з ягонай падачы, то ён у адкрытую хлусіць, што таксама гонару не дадае. Але мы бачым, што спісы дзейнічаюць. Прыкра для чалавека, калі ў падручніках праз 50 гадоў пра яго напішуць: «Быў знішчальнікам беларускай культуры».

***— Вы адказалі ідэалагічнай машыне і заклікалі мастакоў да салідарнасці. Але Курэйчык мала залежыць ад беларускіх замоўцаў. А што рабіць мастакам, якія знаходзяцца на дзяржаўным фінансаванні ці выступаюць на беларускіх пляцоўках?***

— Мае творы, сапраўды, у асноўным ставяцца ў Расіі. Там ніхто не пытаецца, правільны я «ідэалагічна» ці няправільны. І нікому няма ніякіх спраў да гэтых спісаў. Але я не ведаю, як бы паступіў, калі б быў на дзяржаўнай службе.

Беларускія музыкі значна ў больш цяжкай сітуацыі. Тыя ж канцэрты адменены. Як ужо адбылося з Вайцюшкевічам, «Нейра Дзюбелем», «Ляпісамі». Трэба казаць пра гэта, падтрымліваць адзін аднаго.

***— Вы працуеце з расійскімі кінапрадзюсарамі. Але хіба масавая расійскае кіно — гэта не тая ж цэнзура, толькі ў іншай абгортцы?***

— Гэта зусім іншая справа. Гэта бізнэс. Ты можаш пагадзіцца, можаш адмовіцца. Прадзюсар патрэбны сцэнарысту, але і сцэнарыст патрэбны прадзюсару. Вы дамаўляецеся. Бываюць і складанасці, як на апошняй стужцы «Службовы раман. Наш час». Дарэчы, за апошнія тыдні стужка ў пракаце заняла першае месца і набрала болей за 6,5 мільёна долараў.

Праца ў прадзюсарскім кіно — гэта гульня па дакладных правілах, дзе бакі паважаюць адзін аднаго.

***— Дапусцім, Курэйчыку беларускія ўлады прапанавалі — па ўсіх правілах — скласці сцэнар фільму з Аляксандрам Лукашэнкам.***

— Гэта не мая тэма.

***— Але ў фільм «Ёлкі» вы ўпляшчылі расійскага прэзідэнта Дзмітрыя Мядзведзева.***

— Гэта была ідэя Цімура Бекмамбетава.

***— Але ж вы сцэнарыст.***

— Так фільм — камедыя. Усё там зроблена дастаткова іранічна, лёгка, з жартамі. Мядзведзеў, калі стужку паглядзеў, згадзіўся запісаць кавалачак для выступу ў фільме.

***— Дык ён там сапраўды зняўся, гэта не кампутарная імітацыя?***

— Так, сапраўды зняўся. Калі фільм быў ужо завершаны, застаўся навагодні выступ расійскага прэзідэнта. Ён і быў запісаны.

***— І стужка дадала яму палітычнай папулярнасці. І потым вобраз крамлёўскага кіраўніка, які ўсё бачыць з акна свайго палацу...***

— Ізноў-такі, у гэтым ёсць іронія. І потым, у расійскага кіно свае задачы. Розныя нацыі, розныя тэрыторыі, розныя групы — трэба знітаваць усіх разам, паказаць, што не ворагі адзін аднаму. Розных людзей злучылі пацешнымі навагоднімі гісторыямі, што адбываюцца ў розных месцах.

***— Такім чынам, Андрэй Курэйчык працуе над папулярным ідэалагічным кіно. Дык як наконт ідэалагічнага беларускага твору?***

— У свой час я прапаноўваў міністру культуры свою п'есу «Скарына». Але што цяпер — не ведаю.

***— Праз 50, лепей — 100 гадоў, якое месца ў беларускай культуры будзе займаць Андрэй Курэйчык?***

— Думаю, дзесьці паміж Купалам і Коласам. Хаця не. Па алфавіце: Купала, Курэйчык.

Спадзяюся, у гісторыі беларускага тэатру маё імя застанецца. І потым — я яшчэ не ўсё сказаў.

ЦІКАВА

# БЕЛА-ЧЫРВОНЫ КРАСАВІК

## У КНІГАРНІ «ЛОГВІНАЎ» РАСПАЧАЎСЯ МЕСЯЦ ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ




**Цэлы месяц? Цэлы месяц! Цэлы красавік у цэнтры Мінска ў кнігарні «ЛогвінаЎ» (Незалежнасці, 37а) будзе стаяць вялікая паліца з польскімі кніжкамі. Набыткі польскай літаратуры: сучасныя і класічныя, перакладзеныя і ў арыгінале — падыходзь і набывай ці проста чытай. Акрамя гэтага ў кнігарні можна будзе азнаёміцца з польскімі газетамі і мастацкімі альбомамі польскіх мастакоў, а таксама атрымаць у падарунак кнігі беларускіх аўтараў па-польску.**

31 сакавіка, пасля ўрачыстага адкрыцця Месяцу літаратуры, ужо прэзентаваў сваю дзвюхмоўную творчасць беларускі пісьменнік Польшчы Міхась Андрасюк, які паходзіць з Падляшша і жыве ў Беластоку. Андрасюк прадставіў свае апошнія кнігі: па-беларуску — зборнік апавяданняў «Вуліца добрай надзеі», па-польску — аповесць «Wagon drugiej klasy», у якой аўтар выкладае згадкі пра дзяцінства «на заходняй мяжы Белавежскай пушчы».

Напералзе — яшчэ тры сустрэчы з яскравымі літаратарамі Польшчы.

**Ігнацы Карповіч** (Ignacy Karpowicz) нарадзіўся і жыве на Беласточчыне (між іншага, родны пляменнік выбітнага беларуса Польшчы Лявона Тарасевіча). Выпускнік Варшаўскага ўніверсітэта, афрыканіст і іспаніст. Аўтар шэрагу раманаў, адзначаных прэстыжнымі літаратурнымі ўзнагародамі Польшчы. Тэма большасці з іх — лёсы і светаадчуванне людзей, якім наканавана жыць на беларуска-польскім памежжы. А яшчэ Ігнацы размаўляе па-амхарску (на мове эфіёпаў). У Мінску Ігнацы прадставіць сваю апошнюю кнігу «Балядыны і рамансы», падзеі якой адбываюцца на небе, сярод багоў, і на зямлі, сярод людзей, і назва якой адсылае адначасова да драмы Юліуша Славацкага «Баладына», зборніка Адама Міцкевіча «Балады і рамансы», а на беларускую найбольш адэкватна перакладаецца як «Бандароўны і Сон на кургане».

**Міхал Ягела** (Michai Jagiello) нарадзіўся ў 1941 годзе ў вёсцы Янковіцы пад Кракавам. У 1964 годзе скончыў Ягелонскі ўніверсітэт. Празаік, эсэіст, публіцыст і паэт. Аўтар манаграфій па гісторыі літаратуры. Сфера інтарэсаў — шматкультурнасць Польшчы, а таксама супрацоўніцтва ў сферы культуры з Беларуссю, Літвой, Славакіяй і Украінай. У 1989–2006 гадах займаў пасады намесніка міністра культуры Польшчы, дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі. Заўзяты альпініст.

**Лешэк Энгелькінг** (Leszek Engelking) — адзін з найвядомых польскіх паэтаў, перакладчык, мастацтвазнаўца. Скончыў Варшаўскі ўніверсітэт. Выкладаў літаратуру і кіназнаўства. Перакладае з англійскай, рускай, чэшскай, украінскай і беларускай моваў. Аўтар кніг «Хайку ўласныя і чужыя» (1991), «Пяты дом» (1997), «І іншыя вершы». Жыць не можа без чэшскага піва.

### Расклад імпрэзаў Месяца польскай літаратуры ў кнігарні «ЛогвінаЎ»:

**6 красавіка (серада).** Сустрэча з польскім пісьменнікам Ігнацыем Карповічамі і прэзентацыя яго новага раману «Balladyna i romance»/ «Баладына і рамансы». Пры ўдзеле перакладчыцы Марыі Мартысевіч. Пачатак а 19, кнігарня «ЛогвінаЎ».

**13 красавіка (серада).** Сустрэча з публіцыстам, пісьменнікам, даследчыкам літаратуры і еўрапейскіх культурных сувязяў Міхалам Ягелам і прэзентацыя ягонай кнігі «Narody i narodowosci. Przewodnik po lekturach»/ «Народы і нацыянальнасці. Вандроўка па кнігах». Пачатак а 19, кнігарня «ЛогвінаЎ».

**20 красавіка (серада).** Творчая лекцыя і сустрэча з вядомым паэтам і польскім перакладчыкам Набокава Лешэкам Энгелькінгам. Кнігарня «ЛогвінаЎ», пачатак а 19.

Вядоўца ўсіх сустрэч — Андрэй Хадановіч.

Кнігарня «ЛогвінаЎ» знаходзіцца на пр. Незалежнасці 37а, у адным будынку з Галерэяй сучаснага мастацтва «Ў» і барам «Малако» (гэта ў дварах за домам «Подзвіг народа», што на плошчы Перамогі).

ПРЭМ'ЕРА

# ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ ІНВАЛІДАЎ

Эла ОЛІНА

**Фільм «Незвычайныя людзі» прысвечаны дыскрымінацыі інвалідаў у галіне адукацыі. Ён быў прэзентаваны ў Мінску ў цэнтры рэабілітацыі інвалідаў на вул. Варанянскага.**

Стужка зроблена па сцэнару Людмілы Бадзічкі і Віялеты Нядзелькі; ідэя Эніры Браніцкай была рэалізавана пра падтрымцы няўрадавай арганізацыі «Чалавек у нядолі» (Чэхія) і Камітэта абароны рэпрэсаваных «Салідарнасць». Фільм зняў беларускі рэжысёр Сяргей Ісакаў, аўтар дакументальных стужак «Рок назаўжды», «Слуцкі збройны чын», «Гастарбайтар».

«Прынята ставіцца да інваліда як да суб'екта атрымання дапамогі, медыцынскіх паслуг, а не як да аб'екта дзейнасці, персоны, якая выконвае сваю гістарычную ролю. Дзяржава не гатовая да такой парадыгмы адносінаў, — дае каментар у фільме Сяргей Драздоўскі, старшыня Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-вазочнікаў, праваабаронца.

Шлях да вышэйшай і сярэдняй адукацыі для інвалідаў перакрываюць інструкцыі, якія не дазваляюць людзям з фізічнымі абмежаваннямі навучацца па шэрагу спецыяльнасцяў. Фільм прыцягвае ўвагу гледачоў да гэтай праблемы.

Марыя, якая слаба чуе, не захацела быць ні швачкай, ні вязальшчыцай, а вырашыла стаць сурдапедагогам-дэфектолагам. Яна насуперак інструкцыям паступіла ў Педагагічны ўніверсітэт, сабрала ўсе неабходныя медыцынскія даведкі, пры здачы іспытаў набрала больш балаў, чым патрэбна для паступлення.

Аляксандр, сляпы ад нараджэння, вучыўся ў спецыялізаванай школе ў Гродна. Ён чытае кнігі з дапамогай шрыфту Брайля, засвоіў 6 праграм на капутары, любіць працаваць з музыкай і тэкстам, грае на музычных інструментах. Марыць стаць гукарэжысёрам.

Мэры грае ў Народным тэатры мімікі і жэста. Нядаўна яна выконвала вытанчаную ролю Канчыты Аргуэльё ў музыкальнай пастаноўцы «Юнона і Авось», якую здзейсніла маладзевая студыі «Дэбют» з удзелам артыстаў, якія не чуюць. Цяпер Мэры вывучае псіхалогію ў жаночым універсітэце «Энвіла».

У герояў фільма адчуваецца імкненне спраўдзіць сваю мару, набыць адукацыю, яны вераць, што будуць патрэбны грамадству.

ВЫСТАВА

# СУЧАСНЫЯ ПЕРАДЗВІЖНІКІ Ў ПРУЖАНАХ

Алёна ЗЯЛЕВІЧ,
ст. навуковы супрацоўнік музея-сядзібы «Пружанскі палацык»

**Якія б подыхі моды ні з'яўляліся, прыгожае нязменнае і зразумелае кожнаму, калі яно ідзе ад сэрца таленавітага чалавека. Менавіта такіх людзей аб'яднала «Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў. XXI стагоддзе» з Санкт-Пецярбурга, што прыехала на Брэстчыну ў горад Пружаны са сваёй вялікай выставай, якая працуе з 11 сакавіка ў музеі-сядзібе «Пружанскі палацык».**



Старшыня таварыства Валер Выбаржанін

Узнікла таварыства ў 2005 годзе ў Санкт-Пецярбургу з мэтай адрадзіць лепшыя традыцыі рускага мастацтва, вядомыя па творах Крамского, Пярова, Шышкіна, Мясаедава, Рэпіна і іншых перадзвіжнікаў XIX стагоддзя. (Падрабязная інфармацыя пра аб'яднанне на сайце www.art-vystavka.spb.ru.)

«У адрозненне ад сваіх папярэднікаў, — распавёў старшыня таварыства спадар Выбаржанін, — перадзвіжнікі цяперашняга часу нароўні з рэалістычным (у вузкім сэнсе) падыходам да мастацтва прапануюць і іншыя, правераныя часам мастацкія канцэпцыі. Стылёвая разнастайнасць, адрозненне ў творчым падыходзе да прадмета і аб'екта мастацтва сучасных перадзвіжнікаў не з'яўляюцца самамэтай. Шукаць чалавека ў гэтым свеце — вось сакрэтны лозунг таварыства. Кожная з прац адрасавана Чалавеку і ў кожнай з іх адчуваецца павага да яго. Дзейнасць перадзвіжнікаў не абмяжоўваецца экспазіцыяй. Майстар-класы для юных мастакоў, удзел у навуковых канферэнцыях, стварэнне новых метадаў даследаванняў алейнага жывапісу, праца з бібліятэкамі, папаўненне фондаў музеяў працамі ўдзельнікаў, дапамога адоранай моладзі і падтрымка старых мастакоў, шэфства над галерэяй Е.Е. Маісеенка ў Беларусі (г. Буда-Кашалёва), арганізацыя фэстаў мастацтваў і стварэнне негатэкі выяўленчага мастацтва.

Выстава майстроў з Расіі, Нямеччыны, Польшчы і Беларусі, арганізаваная ў музеі-сядзібе «Пружанскі палацык», выходзіць за рамкі проста экспазіцыі. Гэта досвед новай вялікай мастацкай ідэі стварыць даўно чаканы культурнай грамадскасцю рух. Ідэю падалі тыя, хто яшчэ памятае старое мастацтва і стаміўся ад і прафанацыі мастацтва, ад наватарства дзеля наватарства. Задачу злучыць творчы досвед і пошукі мастакоў і скульптараў з патрабаваннямі часу і спрабуе вырашыць таварыства.




Барыс Кельберэр. «Выспы. Анега»



Працы перадзвіжнікаў утульна ўпісаліся ў інтэр'ер музея

Увагу наведвальнікаў выставы прыцягваюць працы Юрыя Белазерскага. У прыватнасці, шмат спрэчак выклікала карціна «Гарызонт далёкі круглы». Яна напісана вольна і шырока, як дакументальнае кіно, пазбаўлена пастановачнасці. Разнастайны па колеры бязмежны зялёны дыван, лёгкая імгла смугі, што ахутвае далеч, аб'ядноўвае ўсе колеры ў адзіный задуменнай маляўнічай гаме. Агульны халодны блакітна-зялёны тон стварае высокую ступень экзістэнцыйнай адкрытасці, такі памежны стан выклікае збянтэжанасць.

Карціна ж Зміцера Васільева «Дахаты» перадае сумную долю самотных вясковых жанчын. Выява сялянкі наўмысна задушана, яна нібы ўрасла ў зямлю і насілу рухаецца ўгару за каровай-карміцелькай. Карціна мае гарызантальны фармат, але прастора развіваецца ўвышыню, перадаючы бясконцасць адзіноты і безвыходнасць старасці. Такія ж асацыяцыі выклікае праца Мікалая Лукашука «Дарога ў сельмаг». Думаю, шматлікія гледачы ў гэты момант узгадваюць сваіх старых бацькоў.

З вялікай сімпатыяй успрымаецца «Нацюрморт з кабачком» Любові Вячаслававай. Грузны кабачок стварае эфект бомбы, якая не разарвалася, быццам звалілася на стол і перавярнула кошык з гароднінай. Момант ненаўмыснасці, імкненне зрабіць кампазіцыю як бы выпадковай выклікаюць у гледача ўсмешку.

Уражанне абуджэння прыроды перадаў Уладзімір Брат карцінай «Гусакі». Растае брудны снег, адталыя воды сцякаюць у сажалку, і чарада тоўстых, ацалелых на Каляды гусакоў цягнецца да вады. Чалавек у гэтай карціне застаўся за кадрам, і ўсё ж яго прысутнасць адчуваецца.

Прыцягвае ўвагу дэкаратыўная шчодрая маляўнічасць і шырыня мазка на карціне Наталлі Вішняковай «Танец». Фарбы літаральна вылітыя на палатно, пры гэтым каляровыя плямы нагрувашчаны зусім не хаатычна. Святло льецца на карціну, пракрадаецца скрозь яе, і чырвоны колер пераліваецца ва ўсім багацці і разнастайнасці адценняў. Мастак стварыў вельмі ясную спіральную кампазіцыю, спакойнае чаргаванне планаў перадае адчуванне сапраўднага танцавальнага вітка, і пачуццям становіцца цесна ў традыцыйных рамках.

Адмысловай увагі заслугоўваюць нешматлікія скульптурныя кампазіцыі. Тэракотавая статуэтка «Фінскі рыбак» Уланава Вячаслава прыцягвае сваёй знарочыстай адсутнасцю глазуры. Трохі цяжкавагавая постаць, грубыя, масіўныя, як калоны, ногі, мускулістыя, перабольшана цяжкія шурпатыя рукі перадаюць адчуванне цяжару рыбацкага побыту.

Твор Барыса Дзергачова «Месца пад сонцам» — быццам лозунг, своеасаблівы маніфест. Сланечнікі, кветкі сонца, яшчэ да нараджэння маюць сваё месца пад ім, але мае сваё месца і абарванае пудзіла.

Мастакі, прадстаўленыя на выставе, па-свойму адмысловыя і ўнікальныя. Дзівіць багаты жанравы рэпертуар і пашыраны круг тэм і сюжэтаў: нароўні з пабытавай карцінай вылучаюцца партрэты і пейзажы, гістарычны жывапіс і батальныя сцэны. Эмоцыі, выкліканыя кожнай працай, бясконцыя. Гэта трэба ўбачыць, адчуць, дакрануцца вокам.

Запрашаем усіх аматараў прыгожага, незалежна ад узросту і мастацкіх пераваг, наведаць выставу, яна — сапраўдны падарунак. Творчасць сучасных перадзвіжнікаў нікога не пакіне абыякавым.

**P.S.:** Выстава будзе працаваць да 3 красавіка. Кошт квіткоў: для школьнікаў — 3500 рублёў, для дарослых — 5000 рублёў.

ВЫСТАВА

# СВЯТАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

Аляксей ХАДЫКА

**У Нацыянальным мастацкім музеі адчынілася ўнікальная выстава — «Адкрыццё святой прыгажосці».**

Экспануецца дзясятак старых беларускіх абразоў, вернутых да жыцця рэстаўратарамі музея — Сяргеем Шацілам, Святланай Дзікуць, Дзмітрыем Карліонавым.

Унікальнасць экспазіцыі ў тым, што цягам стагоддзяў творы беларускага рэлігійнага мастацтва ў выніку шматлікіх інтэрвенцый ворагаў і іх умяшальніцтва ў царкоўнае жыццё Беларусі падлягалі амаль татальнаму знішчэнню. Вось і экспанаваныя абразы пракрокаў і апосталаў з галоўнага іканастасу Жыровіцкага манастыра ацалелі амаль цудам.



Створаныя яны, як давёў польскі даследчык Войцэх Баберскі па матэрыялах архіва манастыра, захаваных у бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта, у 1732–1733 гадах. Зберагліся кантракты пінскага біскупа Георгія Булгака са сніцарамі (разьбярамі) Пятром Пжэлускім і Францішкам Пшэтульскім на выкананне разьбянога атачэння ікон, размешчаных у тры ярусы да самых зводаў царквы.

Але і сёння Руская праваслаўная царква, якая лічыць Беларусь сваёй «кананічнай тэрыторыяй», упарта змагаецца супраць нацыянальнага беларускага мастацтва ў прысабечаных ёй храмах, асабліва калі гэта мастацтва — уніяцкае, як у выпадку з жыровіцкімі абразамі.

Гэтым разам «развод» царквы і беларускай дзяржавы адбыўся больш-менш цывілізавана. Царква атрымала сродкі на рамонт кляштара і замяніла старасвецкую прыгажосць на тое, што яна лічыць кананічным (сучасныя работы, выкананыя ў мёртвай псеўдамаскоўскай стылістыцы), а шэдэўры мастацтва дасталіся Музею. Безумоўны плюс у тым, што яны захаваюцца, і іх убачаць значна больш сапраўдных аматараў прыгажосці.

З мясцовага, апостальскага і прарочага чыноў жыровіцкага іканастаса музею ў 2009 годзе перададзены 7 абразоў, на выставе экспануюцца 4 — парная ікона пракрокаў і тры дошкі з выявамі апосталаў. Творы гэтыя ўнікальныя тым, што адлюстроўваюць стылёвую эвалюцыю беларускага іканапісу ў першай палове XVIII стагоддзя. Напісаныя на тонкай хваёвай дошцы па тонкім ляўкасе, яны пазбаўлены традыцыйнага для ранейшага часу разьбянога арнаменту па залочаным фоне. Рэнесансная іканаграфіі і вытанчанай тэхніцы еўрапейскага жывапісу эпохі барока адпавядаюць рэалістычныя фоны з жывым адлюстраваннем нябёсаў.

Апрача жыровіцкіх твораў гледачам прадстаўлены два выключныя шэдэўры — «Маці Божая» і «Спас» з вёскі Галынка на Міншчыне — работы якраз з тыповым для нацыянальнай іканапіснай школы XVII стагоддзя разьбяным арнаментам залатых фонаў. І некалькі рэлігійных карцін на палатне, для збераження якіх аснову жывапісу даводзілася дублюваць, ратаваць краі палотнаў, пераносіць аўтарскі жывапіс на больш трывалы матэрыял, расчышчаць пазнейшыя запісы і бруд. Тым і цікавыя рэстаўрацыйныя выставы, што яны паказваюць увесь аб'ём цяжкай працы, патрэбнай для вяртання твораў экстра-класа з фізічнага небыту.

ЗНАХОДКА

# А ШТО НАМ ГЭТЫЯ КОСЦІ

Тацццяна ШАПУЦЬКА

**Падчас раскопак ва ўнутраным дворыку кляштара бернардынцаў у Мінску знайшлі рэшткі людзей.**

«Хутчэй за ўсё, гэта пахаванні тытулаванага духавенства, — мяркуе спадарыня Станіслава, верніца, якая рэгулярна прыходзіць на малітву да касцёла Святога Язэпа і служыць пры адным з мінскіх касцёлаў. — Пра косці мне сказалі самі будаўнікі. Адзін маладзенькі ў мяне пытаецца: «Бабуля, я як капаў, дык рыдлёўкай выпадкова адзін чэрап праламаў. Гэта страшны грэх?»

— Унутры самога дворыка знайшлі не так і шмат касцей, больш — вунь там, — рукой указвае на агароджанае месца па вуліцы Герцэна сталы вартаўнік. Агулам — рэшткі 51 чалавека. Косці і чарапы забралі археолагі. А што нам гэтыя косці? Зараз імі толькі ў футбол гуляць.

— Маліцца за іх трэба.

— Я сваё ўжо адмаліўся...

Жанчына просіць вартаўніка пусціць паглядзець на разрытыя магілы. Стары доўга адпіраецца, але, пераадолеўшы страх перад прапрабам Мішкам («Прыб'е ж, калі даведаецца!), вядзе нас у кляштар. Спускаемся па высокіх прыступках, мінаем прыгожыя скляпенні.

— Вось тут, — шэпча нам стары вартаўнік і адчыняе дзверы...

З таго боку на нас пытальна паглядае шыракаплечы мужчына год трыццаці.

— Мішка, Мішка! Дазволь! На экскурсію вяду, — умольваючы лямантуе вартаўнік.

— Сынок, мы толькі памолімся за рэшткі, — просіць Станіслава.

— Гэта не храм! Прэч! — гаркае прараб.

Ужо за брамай кляштара мы чуем крыкі «Мішкі»:

— Якая экскурсія!.. (далей — не для друку).

— Мужчына, вы ў святым месцы, што вы гаворыце?

— Прэч, каму я сказаў!

Станіслава распавяла, што вернікі наведалі Тадэвуша Кандрусевіча і расказалі яму пра гэтыя знаходкі. Ён адказаў, што будзе ўсё высвятляць.

КАНЦЭРТ

# «ТЫГРОВЫЯ ЛІЛЕІ» Ў «РЭАКТАРЫ»

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Тыдзень таму мне патэлефанаваў сябар з Харкава і папрасіў купіць 5 квіткоў у мінскі клуб «Рэактар» на 10 красавіка. Так я даведалася, што ў Мінск прыязджае легендарны гурт «The Tiger Lilies».**

Яны ствараюць эклектычную і эксцэнтрычную музыку незвычайнай прыгажосці і эмацыйнай сілы аднымі толькі акустычнымі інструментамі, ператвараючы жывыя выступы ў эпатажнае шоў і вясёлы тэатралізаваны трэш. Яны спяваюць аб прастытутках і суцінёрах, нямоглых старых і інвалідах, трансвеститах і фрыках, наркаманах, бамжах і няўдачніках — і пра ўсё з вялізным пачуццём гумару.

Гурт існуе з 1989 года. І выступае паўсюль: ад цесных пракураных англійскіх пабаў да галоўных залаў усіх сталіц зямнога шара. Іх творчы нарабак — 23 альбомы, іх супольны альбом з «Kronos Quartet» — «Gorey End» быў намінаваны на прэмію «Грэмі» ў 2003 годзе. Іх музыку выкарыстаў у фільме «Давай зробім гэта пахуткаму» кінарэжысёр Сяргей Бадроў-старэйшы, пасля чаго ён зняў пра гурт поўнаметражную дакументальную кінастужку «The Tiger Lillies».

Музыка «Тыгровых лілеяў» — для тых, хто адзначае нарадзіны ў лесе зімою, ходзіць па лужынах у квятчастых гумовых ботах і вешае цацкі на хмызы бэзу, якія толькі што адцвілі. Карацей — для такіх жа фрыкаў, як і яны самі. «Калі яны такія папулярныя, чаму яны не ў «Мінск–Арэне»? — здзіўляецца прадавачка квіткоў, атаварваючы ўжо дзясятага кліента за паўдня. «Яны не папулярныя — яны культавыя. Ёсць нюансы», — папраўляюць у чарзе.

Два духоўныя пабрацімы адвязных брытанцаў у нашай музычнай прасторы — фрык-кабарэ «Серебряная свадьба» і гурт «Ленинград» Сяргея Шнурава. Юрэк Якубаў — той самы мой сябар з Харкава, лідар музычнага гурта «Раскардаш-аркестр» — так тлумачыць попыт на квіткі: «Мы едзем у Мінск, бо «Тайгер Ліліз» — гэта прыблізна наш жанр, бо мы любім змрочныя жарты і бо бліжэй да нашых краёў яны не бываюць. Ну а харошых фрык-кабарэ ў свеце не так шмат увогуле, каб прапусціць такі канцэрт».

**Жывы Гук**

**Квіткі:**
60 000 — папярэдне ў касах горада
70 000 — у дзень канцэрту
80 000 — месца за столікам (1 паверх)
100 000 — месца за столікам (2 паверх)

**Месцы продажу:**
ГЦ «Купалаўскі», крама «ВООМ. Свет навушнікаў», пав.19
ГЦ «Рыга», крама «ВООМ. Свет навушнікаў», пав.18

**Інфалінія:**
+37529 6782399
+37529 8782399







Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 347

Падпісана да друку 1.04.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.